WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 СНЕЖНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 255
(26863)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 29 снежня разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

**ДВОРНІКА Уладзіміра Андрэевіча** — старшынёй Гомельскага аблвыканкама;

**РУСЕЦКАГА Анатоля Максімавіча** — старшынёй Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

**ЗІНОЎСКАГА Уладзіміра Іванавіча** — старшынёй Нацыянальнага статыстычнага камітэта;

**АМЕЛЬЯНОВІЧА Міхаіла Міхайлавіча** — міністрам лясной гаспадаркі;

**ВАШЧАНКУ Уладзіміра Аляксандравіча** — міністрам па надзвычайных сітуацыях;

**ЖАДОБІНА Юрыя Віктаравіча** — міністрам абароны;

**ЖАРКО Васіля Іванавіча** — міністрам аховы здароўя;

**КАЧАНА Алега Леанідавіча** — міністрам спорту і турызму;

**КУЛЯШОВА Анатоля Нілавіча** — міністрам унутраных спраў;

**ЛАТУШКУ Паўла Паўлавіча** — міністрам культуры;

**МАРТЫНАВА Сяргея Мікалаевіча** — міністрам замежных спраў;

**МАСКЕВІЧА Сяргея Аляксандравіча** — міністрам адукацыі;

**НІЧКАСАВА Анатоля Іванавіча** — міністрам архітэктуры і будаўніцтва;

**АЗЯРЦА Аляксандра Уладзіміравіча** — міністрам энергетыкі;

**ПРАЛЯСКОЎСКАГА Алега Вітольдавіча** — міністрам інфармацыі;

**РУСАГА Міхаіла Іванавіча** — міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання;

**СНАПКОВА Мікалая Генадзьевіча** — міністрам эканомікі;

**ХАРКАЎЦА Андрэя Міхайлавіча** — міністрам фінансаў;

**ЦАЛКО Уладзіміра Рыгоравіча** — міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя;

**ШЧЭРБУ Івана Іванавіча** — міністрам транспарту і камунікацый;

**ШЧОТКІНУ Мар'яну Акіндзінаўну** — міністрам працы і сацыяльнай абароны;

**ВОЙТАВА Ігара Вітальевіча** — старшынёй Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях;

**ГУРУЛЁВА Сяргея Пятровіча** — старшынёй Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта;

**ЗАЙЦАВА Вадзіма Юр'евіча** — старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі;

**КАРАШКОВА Валерыя Мікалаевіча** — старшынёй Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі;

**КУЗНЯЦОВА Георгія Іванавіча** — старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці;

**РАЧКОЎСКАГА Ігара Анатольевіча** — старшынёй Дзяржаўнага пагранічнага камітэта;

**ШПІЛЕЎСКАГА Аляксандра Францавіча** — старшынёй Дзяржаўнага мытнага камітэта;

**МАРТЫНЕЦКАГА Канстанціна Аляксеевіча** — кіраўніком Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

**ГУЛЯКУ Леаніда Паўлавіча** — Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

**СІДЗЬКО Сяргея Дзмітрыевіча** — старшынёй праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў.



### ДВОРНІК Уладзімір Андрэевіч

*Старшыня Гомельскага аблвыканкама*

Дворнік Уладзімір Андрэевіч нарадзіўся 16 красавіка 1963 года ў в. Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працаваў трактарыстам калгаса імя Дзяржынскага Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

Пасля заканчэння Рэчыцкага зооветтэхнікума быў галоўным ветэрынарным урачом калгаса «Усход» Нараўлянскага раёна, намеснікам старшыні калгаса «Дружба» Мазырскага раёна, галоўным дзяржаўным ветэрынарным урачом Мазырскага раёна, дырэктарам РУП «Саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна Гомельскай вобласці.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу трэцяга склікання. Выбраны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання ад Гомельскай вобласці.

Раней Уладзімір Дворнік займаў пасаду старшыні Мазырскага райвыканкама.



### РУСЕЦКІ Анатоль Максімавіч

*Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

Русецкі Анатоль Максімавіч нарадзіўся ў 1951 годзе ў горадзе Барысаве Мінскай вобласці. У 1973 годзе скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Доктар тэхнічных навук, прафесар.

Працаваў канструктарам, вядучым канструктарам Спецыялізаванага канструктарскага тэхналагічнага бюро з доследнай вытворчасцю Інстытута фізікі АН БССР, вядучым інжынерам Мінскага філіяла Маскоўскага канструктарска-тэхналагічнага бюро, затым Асаблівага канструктарскага бюро «Імпульс», вядучым інжынерам, начальнікам сектара Канструктарскага бюро дакладнага электроннага машынабудавання НВА «Планар», галоўным інжынерам, дырэктарам завода «Электронмаш» пры КБДЭМ НВА «Планар», прэзідэнтам дзяржаўнага навукова-вытворчага канцэрна дакладнага машынабудавання «Планар» — дырэктарам завода «Электронмаш». З 1997 года — намеснік, першы намеснік міністра прамысловасці, у 2002—2003 гадах — старшыня Камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце Міністраў Беларусі. У 2003—2009 гадах быў міністрам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Да цяперашняга назначэння Анатоль Русецкі працаваў дырэктарам дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут цепла- і масаабмену імя А.В. Лыкава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».



### ЗІНОЎСКІ Уладзімір Іванавіч

*Старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта*

Зіноўскі Уладзімір Іванавіч нарадзіўся ў 1955 годзе ў г.п. Ялізава Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1978 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава, у 1993 годзе — Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У 1981—1986 гадах — старшы інжынер Галоўнага ўпраўлення вылічальных работ Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення БССР, старшы, вядучы эканаміст упраўлення статыстыкі прамысловасці ЦСУ БССР, памочнік начальніка ЦСУ БССР, затым Дзяржкамітэта БССР па статыстыцы. У 1986—1989 гадах — намеснік начальніка Статыстычнага ўпраўлення Мінскай вобласці, намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення статыстыкі. У 1989—1992 гадах — у Савеце Міністраў: старшы рэферэнт сектара эканамічнага аналізу і народна-гаспадарчых планаў эканамічнага аддзела, вядучы спецыяліст эканамічнага аддзела, вядучы спецыяліст упраўлення эканомікі і знешніх сувязяў, вядучы спецыяліст упраўлення эканомікі, галоўны спецыяліст сектара прагназавання і аналізу сацыяльна-эканамічнага развіцця ўпраўлення эканомікі Кіраўніцтва справамі Савета Міністраў. У 1992—1998 гадах — першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу, першы намеснік міністра статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь, са снежня 1998 года — міністр статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь.

З кастрычніка 2008 года — старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь.



### АМЕЛЬЯНОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч

*Міністр лясной гаспадаркі*

Амельяновіч Міхаіл Міхайлавіч нарадзіўся ў 1958 годзе ў в. Клюкавічы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1980 годзе скончыў Беларускі тэхналагічны інстытут імя С.М. Кірава, у 1999 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

У 1980—1985 гадах працаваў ляснічым Асінаўскага лясніцтва Багушэўскага лясгаса Віцебскай вобласці, у 1985—1997 гадах — галоўным ляснічым Багушэўскага лясгаса Віцебскай вобласці, у 1997—1999 гадах — дырэктарам Бешанковіцкага лясгаса Віцебскай вобласці. З 1999 года працаваў генеральным дырэктарам Мінскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання.

З сакавіка 2010 года — міністр лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Гаспадары

## АРКЕСТРАВЫ ВАЎКАНОСАВЕЦ





**АЛЯКСАНДР Антонавіч Харкевіч справіў сваё 75-годдзе, але жыць спакойна, як іншыя ў гэтым узросце, не можа. Не ўмее і не хоча. Калі ён выходзіць на сцэну са сваімі лыжкамі, трашчоткамі, бубнамі, зала ад душы пляскае яму ў далоні. Настаўніцкі ансамбль «Бяседачка» з вёскі Ваўканосава нельга ўявіць без чалавека-аркестра, які здолеў усе свае шумавыя інструменты змайстраваць уласнымі рукамі. Рукамі, якім ад паходжання наканавана было трымаць касу, сякеру і рыдлёўку.**

Не, ён ніколі не адмаўляўся ад бясконцай сялянскай працы і сваё вясковае жыццё ні на якое іншае не прамяняў, хоць і мог бы. Жыў годна, згодна з хрысціянскай мараллю. Працаваў у школе настаўнікам фізкультуры і спеваў. Хапала часу займацца сталярнай справай ( з-за яе пальцы на руках папсаваў). І дудку змайстраваць, і на бяросце пайграць. І пагрукаць на бубне, якому ўжо з паўсотні гадоў.

— Мая мама добра іграла на балалайцы і бубне, — кажа Аляксандр Антонавіч. — Наогул, па дзеду ў нас усе былі добрымі музыкантамі.

Аляксандр Харкевіч памятае, як яму, малому хлапчуку, прыходзілася дапамагаць на бубне вясковым гарманістам. Не прасілі, а давяралі, бо ў малога дужа добра атрымлівалася. Музыкантаў у вёсцы было багата, і кожны хацеў мець добрага бубнара, які да таго ж яшчэ і выдатна танчыў. Калі звычайнага бубна яму здалося недастаткова, стаў узбагачаць рытмічную афарбоўку экзатычнымі шумавымі прыладамі. Асабліва «падсеў» на драўляныя лыжкі. Нават вынайшаў уласную тэхналогію вырабу парных лыжак, якія майстар называе вясельнымі.

— Вясельныя, бо з дубу і яблыні, клёну і бярозы. Сэнс улавілі? — Аляксандр Антонавіч дэманструе адрозненні ў вышыні гучання драўляных апалонікаў, лупячы імі аб далоні і каленкі. І шкадуе, што няма каму ў гэты момант яму падыграць.

Гарманістаў у вёсцы Ваўканосава больш няма. І тым не менш традыцыю выканання на сваіх прыладах Аляксандр Харкевіч захоўвае. Робіць новыя інструменты для іншых, удзельнічае ў выстаўках і канцэртах. За гэта і быў адзначаны Спецыяльнай Прэміяй Прэзідэнта.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Круглянскі раён.*



### ВАШЧАНКА Уладзімір Аляксандравіч

*Міністр па надзвычайных сітуацыях*

Вашчанка Уладзімір Аляксандравіч нарадзіўся ў 1958 годзе ў п. Троіцка-Пячорск Комі АССР. У 1983 годзе скончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, у 2002-м — Камандна-інжынерны інстытут МНС Рэспублікі Беларусь.

У 1976 годзе працаваў зборшчыкам Магілёўскага тарарамонтнага прадпрыемства трэста «Белтара». У 1976—1978 гадах служыў у радах Узброеных Сіл. У 1978—1980 гадах працаваў заточнікам Магілёўскага завода «Строммашына», у 1980—1981-м — малодшым інспектарам дзяржаўнага пажарнага нагляду самастойнай ваенізаванай пажарнай часці нумар 2 па ахове Ленінскага раёна г. Магілёва, у 1981—1983-м — начальнікам варты самастойнай ваенізаванай пажарнай часці нумар 2 па ахове Ленінскага раёна г. Магілёва, у 1983—1986 гадах — намеснікам начальніка самастойнай ваенізаванай пажарнай часці нумар 2 па ахове Ленінскага раёна г. Магілёва. У 1986—1994 гадах — начальнік самастойнай ваенізаванай пажарнай часці нумар 2 па ахове Ленінскага раёна г. Магілёва, у 1994—1996-м — намеснік начальніка УВПС УУС Магілёўскага аблвыканкама па службе, падрыхтоўцы і пажаратушэнні. У 1996—1997 гадах займаў пасаду намесніка начальніка Магілёўскага абласнога УВПС ГУВПС МУС Рэспублікі Беларусь. У 1997—1999 гадах быў начальнікам ваенізаванай пажарнай часці нумар 2 Ленінскага раёна г. Магілёва. У 1999—2000 гадах — залічаны ў кадры МНС Рэспублікі Беларусь з праходжаннем службы на раней займаемай пасадзе. З красавіка па кастрычнік 2000 года — начальнік пажарнай аварыйна-выратавальнай часці нумар 2 Ленінскага раёна г. Магілёва Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Рэспублікі Беларусь.

З кастрычніка 2000 года быў начальнікам установы «Магілёўскае абласное ўпраўленне МНС Рэспублікі Беларусь». Дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.



### ЖАДОБІН Юрый Віктаравіч

*Міністр абароны*

Жадобін Юрый Віктаравіч нарадзіўся ў 1954 годзе ў Днепрапятроўску (Украіна).

Ва Узброеных Сілах — з 1972 года. У 1976 годзе скончыў Казанскае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча, у 1985 годзе — камандны факультэт Ваеннай акадэміі бранятанкавых войскаў у Маскве. Генерал-маёр. З 1976 па 1990 год прайшоў усе службовыя ступені ад камандзіра ўзвода да камандзіра палка. У 1990—1999 гадах служыў на камандных пасадах у сістэме Грамадзянскай абароны Беларусі, унутраных войсках МУС рэспублікі. З 1999 года — намеснік міністра ўнутраных спраў — камандуючы ўнутранымі войскамі. З верасня 2003 года — начальнік Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У ліпені 2007 года назначаны старшынёй Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Генерал-лейтэнант (2009). З ліпеня 2008 года — дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Са снежня 2009 года — міністр абароны Рэспублікі Беларусь.

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.12.2010 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 000,00 | 1 чэшская крона | 155,98 |
| ▼ 1 еўра | 3 936,60 | 1 польскі злоты | 989,27 |
| 1 латвійскі лат | 5 556,07 | ▼ 1 расійскі рубель | 98,82 |
| 1 літоўскі літ | 1 141,49 | 1 украінская грыўня | 376,58 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 30,3592 |
| 10 UAH | 38,1277 |
| 1000 BYR | 10,1164 |
| EUR | 39,9011 |

massager.by
СНАМИ
Массажные кресла и кушетки
От **3 000 000** рублей.
Наличный и безналичный расчет.
Доставка, подключение, гарантия.
(017) 214-89-65, 230-57-61





### ЖАРКО Васіль Іванавіч

*Міністр аховы здароўя*

Жарко Васіль Іванавіч нарадзіўся ў 1956 годзе ў в. Леснікі Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1984 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. У 1975—1977 гадах служыў у арміі.

У 1984—1991 гадах — урач-інтэрн Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы, урач-тэрапеўт, раённы педыятр, загадчык аддзялення Драгічынскай раённай бальніцы. У 1991—2002 гадах — урач-інспектар, намеснік начальніка ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама. У 2002—2003 гадах — намеснік галоўнага ўрача Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы, дырэктар даччынага ўнітарнага прадпрыемства «Санаторый «Крыніца». У 2003—2005 гадах — генеральны дырэктар УП «Белпрафсаюзкурорт». У 2005—2006 гадах — выконваючы абавязкі генеральнага сакратара Рэспубліканскага камітэта Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

З мая 2006 года — міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.



### КАЧАН Алег Леанідавіч

*Міністр спорту і турызму*

Качан Алег Леанідавіч нарадзіўся ў 1967 годзе ў горадзе Чэрвені Мінскай вобласці. У 1986 годзе скончыў Смілавіцкі саўгас-тэхнікум Дзяржаграпрама БССР, у 1992-м — Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С. Пушкіна.

З 1992 па 1998 год працаваў трэнерам-выкладчыкам у дзіцяча-юнацкіх спартыўных школах Мінскай вобласці. У 1998—2002 гадах быў загадчыкам аддзела па фізічнай культуры, спорту і турызму Лагойскага райвыканкама Мінскай вобласці, з 2002 года — намеснікам старшыні Лагойскага райвыканкама. З 2004-га працаваў начальнікам упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага аблвыканкама.

З чэрвеня 2009 года — міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.



### КУЛЯШОЎ Анатоль Нілавіч

*Міністр унутраных спраў*

Куляшоў Анатоль Нілавіч нарадзіўся ў 1959 годзе ў г. Алі-Байрамлы (Азербайджан). У 1986 годзе скончыў Мінскую вышэйшую школу МУС СССР, у 1992 годзе — Акадэмію МУС СССР. Генерал-маёр міліцыі.

У 1976—77 гадах працаваў трактарыстам Старасельскага лясніцтва Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. У 1977—79 гадах праходзіў службу ва Узброеных Сілах. Працаваў на розных пасадах у сістэме органаў унутраных спраў ад радавога міліцыянера да першага намесніка міністра, доўгі час — у крымінальным вышуку. У 2003 годзе ўзначаліў галоўнае ўпраўленне ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама. Са жніўня па снежань 2008 года — намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі МУС Рэспублікі Беларусь. У снежні 2008 года назначаны першым намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам крымінальнай міліцыі МУС Рэспублікі Беларусь.

З чэрвеня 2009 года — міністр унутраных спраў Беларусі.



### ЛАТУШКА Павел Паўлавіч

*Міністр культуры*

Латушка Павел Паўлавіч нарадзіўся ў 1973 годзе ў Мінску. У 1995 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

У 1995—1996 гадах быў аташэ дагаворна-прававога ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Беларусі. У 1996—2000 гадах займаў пасады віцэ-консула, консула генеральнага консульства Беларусі ў Беластоку (Польшча). У 2000—2002 гадах — начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі. У 2002—2008 гадах — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы.

З чэрвеня 2009 года — міністр культуры Рэспублікі Беларусь.



### МАРТЫНАЎ Сяргей Мікалаевіч

*Міністр замежных спраў*

Мартынаў Сяргей Мікалаевіч нарадзіўся ў 1953 годзе ў г. Ленінакане (Арменія). У 1975 годзе скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін.

З 1975 года — на дыпламатычнай службе: другі сакратар, першы сакратар аддзела міжнародных эканамічных арганізацый, памочнік міністра, намеснік начальніка аддзела міжнародных арганізацый Міністэрства замежных спраў БССР. У 1991—1992 гадах — намеснік Пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры ААН (г. Нью-Ёрк). У 1992—1997 гадах — Часовы паверaны ў справах Беларусі ў ЗША, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у ЗША. У 1997—2001 гадах — першы намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь. У 2001—2003 гадах — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Бельгія, Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры Еўрапейскіх супольніцтвах і Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавора па сумяшчальніцтву.

З сакавіка 2003 года — міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь.



### МАСКЕВІЧ Сяргей Аляксандравіч

*Міністр адукацыі Беларусі*

Раней займаў пасаду старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і сувязях з СНД.

Маскевіч Сяргей Аляксандравіч нарадзіўся 1 жніўня 1953 года ў в. Быкаўка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Я. Купалы, фізік. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар фізікі. Акадэмік Міжнароднай акадэміі адукацыі. Аўтар больш як 250 навуковых прац па фізіцы малекул і менеджменту ў адукацыі.

Працаваў лабарантам, старшым лабарантам, старшым інжынерам, старшым навуковым супрацоўнікам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, прарэктарам па навуковай рабоце і рэктарам Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Дэпутат Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 23-га і 24-га скліканняў. Старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі дзяржаўнага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды». Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.



### НІЧКАСАЎ Анатоль Іванавіч

*Міністр архітэктуры і будаўніцтва*

Нічкасаў Анатоль Іванавіч нарадзіўся ў 1955 годзе ў г. Новасібірску (Расійская Федэрацыя). У 1978 годзе скончыў Новасібірскі інжынерна-будаўнічы інстытут імя В.У. Куйбышава. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

У 1978—1981 гадах працаваў архітэктарам Новасібірскага аддзялення УНДПІЭТ. У 1981—1983 гадах — старшы архітэктар інстытута «Магілёўграмадзянпраект». У 1983—1986 гадах — намеснік галоўнага архітэктара горада — галоўны ландшафтны архітэктар Бабруйскага гарвыканкама. У 1986—1990 гадах быў начальнікам архітэктурна-планіровачнага ўпраўлення Бабруйскага гарвыканкама — галоўным архітэктарам Бабруйска, у 1990—1992 гадах — начальнікам аддзела горадабудаўніцтва — намеснікам начальніка Галоўархітэктуры Дзяржбуда БССР. У 1992—1994 гадах — дырэктар інстытута «Мінскграмадзянпраект». З чэрвеня 1994 па верасень 1994 года займаў пасаду старшыні камітэта архітэктуры, галоўнага архітэктара г. Мінска.

З верасня 1994 года быў намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва.



### АЗЯРЭЦ Аляксандр Уладзіміравіч

*Міністр энергетыкі*

Азярэц Аляксандр Уладзіміравіч нарадзіўся ў 1953 годзе ў в. Гарбацэвічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1976 годзе скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, у 1993-м — Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У 1976—1987 гадах працаваў інжынерам ВТА, інжынерам групы рэжымаў, начальнікам змены котлатурбіннага цэха, старшым інжынерам — кіраўніком лабараторыі металаў, намеснікам начальніка котлатурбіннага цэха Віцебскай ЦЭЦ «Белгалоўэнерга». У 1987—2000 гадах — начальнік службы цеплатэхнічнага абсталявання РЭУ «Віцебскэнерга», намеснік галоўнага інжынера па цеплатэхнічнай частцы ВА «Віцебскэнерга», намеснік генеральнага дырэктара Віцебскага вытворчага аб'яднання энергетыкі і электрыфікацыі. У 2000—2006 гадах — генеральны дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі «Віцебскэнерга».

З мая 2006 года — міністр энергетыкі Рэспублікі Беларусь.



### ПРАЛЯСКОЎСКІ Алег Вітольдавіч

*Міністр інфармацыі*

Праляскоўскі Алег Вітольдавіч нарадзіўся ў 1963 годзе ў г. Загорску Маскоўскай вобласці. У 1985 годзе скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітнае ракетнае вучылішча ППА, у 1998 годзе — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Служыў у Групе савецкіх войскаў у Германіі. У 1990—2002 гадах працаваў у Мінскім ВІЗРВ, Ваеннай акадэміі Беларусі, Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У 2002—2003 гадах узначальваў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Беларускае тэлеграфнае агенцтва». У 2003—2006 гадах працаваў на пасадзе намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2006—2008 гадах — памочнік Прэзідэнта — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 2008 года — дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Са снежня 2009 года — міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

## ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА!

Жэня Рагуцкі, вучань Гомельскай школы № 63, у гэтым пераканаўся асабіста. Хлопчык абмежаваны ў фізічных магчымасцях, але адораны музычным талентам. Супрацоўнікі Навабеліцкага аддзела Дэпартамента «Ахова» МУС Беларусі гэта заўважылі падчас канцэрта, калі дзіця спела для іх песню, якая кранае душу і сэрца. Школьніка, які пастаянна ўдзельнічае ў розных канцэртах, вырашылі ўзяць пад сваю апеку сур'ёзныя мужчыны. Менавіта яны і падарылі дзіцяці на Новы год не толькі мабільны тэлефон, пра які Яўген марыў, але і камп'ютар, стол і крэсла для работы за ім, настольную лямпу, а таксама мікрафон для караоке. Не абышлося і без ласункаў. Пасля гэтага Жэня сказаў, што ён верыць у цуды і сёлетняе свята — самае лепшае ў яго жыцці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

# ПАНЯДЗЕЛАК, 3 СТУДЗЕНЯ

### ПЕРШЫ

**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**6.05, 7.10, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45, 16.05** Nota Bene.
**7.05, 8.10, 18.50, 0.40** Зона Х.
**7.30, 8.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**8.30** «У свеце матораў».
**9.10** Мастацкая гімнастыка. Міжнародныя дзіцячыя спаборніцтвы «Baby cap».
**10.15** Культурныя людзі.
**10.40** Дак. фільм «Sfilata».
**11.05, 17.25 Серыял «Маруся».**
**12.10, 21.45 Серыял «Сваты-4».**
**14.05** «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.30 Серыял «Маршрут міласэрнасці». 1-я серыя.**
**18.25** «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Belarus open-2010. Сёе-тое пра танцы...».
**19.55** Ход у адказ.
**21.00** «Панарама».
**23.50** «Зорнае жыццё». «Белыя вароны».
**0.45** Дзень спорту.

### АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 0.00** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.10 Серыял «Мая жонка мяне прываражыла».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0.15** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Выклік».**
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** Кантрольная закупка».
**13.45** «Модны прыгавор».
**14.50** «Зразумець. Даравацць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**17.05 Серыял «Слова жанчыне».**
**18.20** «Адваротны адлік». «Турызм па-савецку. Выпрабаванне «замежжам».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05 «Галасы». Серыял.**
**22.05 «Гаражы». Серыял.**
**0.20** «Навагоднія фуршэты».
**1.15** Начныя навіны.

### ЛАД

**6.35, 22.40 Серыял «Універ».**
**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00, 15.40, 21.00** Тэлебарометр.
**8.05, 16.50 Серыял «Чыста англійскія забойствы».**
**9.00, 18.00 Меладрама «Сіндром Фенікса». 1-я серыя.**
**10.00** «Смешныя людзі».
**11.50** Школа рамонту.
**12.50 Маст. фільм «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». 1-я серыя.**

**14.05** Дак. фільм «ДзеньTV».
**14.50** М/с «Дракончык і яго сябры».
**15.25** Пазакласная гадзіна.
**16.00, 0.05 Серыял «Налётчыкі».**
**19.05 Камедыя «Зігзаг удачы».**
**20.40** Калыханка.
**21.05** Беларуская часінка.
**22.00 Серыял «Інтэрны».**
**23.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30** «Тыдзень».
**9.35** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40 Серыял «Багатая і каханая».**
**11.30, 17.30** «Званая вячэра».
**12.30 Фільм-казка «Спадарыня мяцеліца».**
**13.50** Навагодні «Зорны рынг».
**15.15** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.00** «КультУРА!».
**16.50** «Далёкія сваякі».
**17.20** «Міншчына».
**18.30 Серыял «Дарослыя гульні».**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15 Маст. фільм «Населены востраў».**
**22.55 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».**
**0.25 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».**

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Эльф, які не верыў».**
**6.30** «Цік-так».
**6.45** М/ф.
**6.55** «Эксперыментатары».
**7.10** М/ф «Пітэр Пэн».
**8.05** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**8.35, 1.55 Маст. фільм «Волга-Волга».**
**10.15** «Любімыя акцёры».
**10.30, 3.35 Маст. фільм «Дванаццатая ноч».**
**12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці.
**12.10** «Хіт-экспрэс».
**13.05 Маст. фільм «Дзецішпіёны».**
**14.30** «Даведнік: Навагодні малдаўскі стол».
**15.20** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Баранеса Карыні».**
**17.10** «Па хвалі маёй памяці».
**18.20** «Простыя лічбы».
**18.50 Маст. фільм «Як Джэк сустрэў Джыл».**
**20.30** Навагодні канцэрт.
**22.20** «Зорнае жыццё».
**23.00** «Паўночнікі».
**23.35 Маст. фільм «Віват, гардэмарыны!».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 10.55, 12.55, 16.25, 19.40, 21.05, 23.45** «Надвор'е».

**7.05** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**7.20, 16.30 Серыял «Прытворшчык».**
**8.40, 12.35, 15.40** «Кінабланот».
**9.00** «К-відэа» для дзяцей».
**9.30, 16.00** «Мультпарад».
**10.00 Серыял «Яе звалі Нікіта».**
**11.00 Камедыя «Мой каханы марсіянін».**
**13.00 Камедыя «Авантурысткі».**
**15.10** Знаёмства «Life».
**17.30** «Мой любімы гадаванец».
**18.00 Серыял «Яна напісала забойства».**
**19.45 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**21.10 Драма «Дзіця Розмары».**

### ВТБ

**6.00, 23.30** Інтэрактыўны блок «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.00, 15.00, 19.00 Серыял «Ранеткі».**
**11.00** Музычны блок «Forward».
**14.00 Серыял «Цуды.com».**
**16.00 Камедыя «Два светы».**
**21.00 Маст. фільм «Птушка развітання».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 11.20, 14.20** М/ф.
**7.10 Камедыя «Людзі і манекены».**
**8.30** «Гарадок».
**9.20, 18.50 Серыял «Еўфрасіння».**
**10.15** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Камедыя «Беражыце жанчын».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.40** Навіны — Беларусь.
**14.30 Серыял «Громавы».**
**17.00** «Аншлаг і Кампанія».
**17.50 Серыял «Чорная багіня».**
**20.20 Маст. фільм «Дзевяць прыкмет здрады».**
**22.05** «Добры вечар з Максімам».
**23.25** «Нічога асабістага».
**23.50** Юбілейны канцэрт групы «Маральны кодэкс».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.45 Серыял «Узяць Таранціну».**
**6.25** «Лепшы горад Зямлі».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** «Сёння».
**8.20 Камедыя «Масквічы».**
**9.05** «Я крочу па Маскве». «Праспяванае ў СССР».
**10.20 Серыял «Дзеці белай багіні».**
**13.20** Ірына Алеграва. Споведзь незламанай жанчыны».
**14.45** «Следства вялі...».
**15.35** «Справа густу».

**16.20 Серыял «Эра стральца».**
**19.30 Серыял «Павуцінне».**
**23.10** «Гарэлка: Гісторыя ўсерасійскага застолля».

### ТНТ

**5.00** М/с «Як кажа Джынджэр».
**6.00** М/с «Дзеткі падраслі».
**6.55** «Нікеладэон на ТНТ».
**8.05, 23.30 Серыял «V-візіцёры».**
**9.00** «Бітва экстрасэнсаў».
**16.45 Камедыя «Самы лепшы фільм-2».**
**18.30** «Камедзі Клаб». Лепшае.
**19.00 Камедыя «Гітлер капут!».**
**21.00, 0.20** «Камедзі Клаб».
**22.00, 23.00, 2.20** «Дом-2».
**1.20** «Comedy Woman».
**3.20** «Інтуіцыя».
**4.20 Серыял «Саша + Маша».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00** Навіны культуры.
**9.15, 0.35, 1.50** Праграма перадач.
**9.25** Казка «Кашчэй Бессмяротны».
**10.30** «Дзед Мароз і Шэры воўк». «Ліса і заяц». М/ф.
**11.05** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**11.30 Маст. фільм «Музычная гісторыя».**
**12.50** Ціна Цёрнер. Юбілейны канцэрт.
**13.50, 0.40** «Экватар». Дак. серыял.
**14.45 Серыял «Гонар і прадузятасць».**
**16.30** Томас Хэмпсан. Гала-канцэрт у Амстэрдаме.
**17.30** «Сусветныя скарбы культуры».
**17.45** «Астравы». Вера Марэцкая.
**18.40 Маст. фільм «Лёгкае жыццё».**
**20.10** Алена Камбурава запрашае...
**21.40 Маст. фільм «Лізавета I».**
**23.30** «Каралі песні». АББА. 1979 год.
**0.25** «Савушкін, які не верыў у цуды». М/ф для дарослых.
**1.35** Э. Грыг. Сюіта для аркестра «Пер Гюнт».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Да і пасля...». Год 1976.
**6.15** Дак. фільм «Права быць першым».
**7.20** Навагодні фільм-канцэрт «Выкраданне».
**9.00 Маст. фільм «Здарэнне, якога ніхто не заўважыў».**
**10.10** «Навагодняя забаўляльная праграма».
**11.00** «Свет сустракае новы год». 1978 год.
**11.50** «КВЗ-90». Фінал. Навагодні.
**14.00** «Быў час».
**14.55** «Тэатральныя сустрэчы».
**16.05** «Шынок «13 крэслаў». 1969 год.
**17.00** «Раніцай». Навагодні мультклас. 1991 год.

**18.10** Дак. фільм «Абавязковая праграма».
**18.40 Маст. фільм «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».**
**20.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР». Лепшае.
**22.10** «Аншлаг». 1983 год.
**23.00** «Што? Дзе? Калі?». 1990 год.
**0.40** «Шчасця вам, людзі!». Навагодняя музычная праграма. 1989 год.
**1.20** «Аншлаг? Аншлаг!». Навагодняя праграма. 1990 год.
**3.00** «Віншаванні «Навагоднняму агеньчыку». 1981 год.
**3.35** Фільм-канцэрт «А трынаццатай гадзіне ночы».

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Маст. фільм «Клуб самагубцаў, або Прыгоды тытулаванай асобы».
**9.45** Камедыя «Барбос у гасцях у Бобіка».
**10.30, 16.40** Маст. фільм «Піраты XX стагоддзя».
**15.45** Камедыя «Драма».
**16.10** Камедыя «Калі казакі плачуць».
**18.30, 0.30** Маст. фільм «Юнацтва Пятра».
**20.45, 2.45** Камедыя «На каго Бог пашле».
**22.30, 4.30** Меладрама «Розныя лёсы».

### ДОМ КІНО

**4.00** Камедыя «Бабнік-2».
**5.10** Камедыя «Кубанскія казакі».
**7.00** Меладрама «Званяць, адчыніце дзверы».
**8.20** Казка «Легенда пра ледзяное сэрца».
**9.30** Камедыя «О, шчаслівчык!».
**11.10** Камедыя «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка».
**12.45** Меладрама «Зімовая вішня».
**14.10** Камедыя «Каханне і галубы».
**15.55** Камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію».
**17.30, 1.30** Серыял «Танга з анёлам».
**20.00** Маст. фільм «Лузар».
**21.50** Меладрама «Зімовы раман».
**23.15** Камедыя «Па сямейных абставінах».

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Меладрама «Год спакойнага сонца».
**10.55, 18.55, 2.55** Камедыя «Мары пра Каліфорнію».
**13.35, 21.35, 5.35** «Заяц над безданню».
**15.15, 23.15, 7.15** Трылер «Брацтва каменя».

### ТБ1000

**3.00, 21.00** Камедыя «У Міні гэта ў першы раз».
**5.00** Драма «Імператарскі клуб».
**7.00** Анімацыйны фільм «Начная бура».
**9.00** Камедыя «Дзіўныя сваякі».

**11.00** Драма «Некалькі дзён у верасні».
**13.00** Драма «Маналетэ».
**15.00** Драма «Ачышчэнне».
**17.00** Камедыя «Братц».
**19.00** Драма «На краі».
**23.00** Камедыя «Вялікі Лябоўскі».
**1.10** Драма «Сцёртая рэальнасць».

### ТБ3

**5.00** Маст. фільм «Мяжа. Таежны раман».
**7.00** М/ф «Бакуган».
**8.00** М/ф «Казкі Альфа».
**8.30** М/ф «Том і Джэры: Палёт на Марс».
**10.00, 14.30** Маст. фільм «Месца сустрэчы змяніць нельга».
**11.30** «Хатні рэстаран».
**12.30, 16.00** «Тайны вялікіх магаў».
**13.30** «Далёка і яшчэ далей».
**17.00** Маст. фільм «Арабскія ночы».
**20.45** Дыскатэка 80-х.
**23.00** Серыял «Зорныя вароты». Лепшыя серыі.
**1.00** Маст. фільм «Поўнач супраць поўдня».

### РАМАНТЫКА

**7.00, 16.55, 21.20, 5.20** «Тайна Лауры».
**7.55, 10.40, 20.30** «Анучная лялька».
**8.50, 14.10, 0.55** «Ніколі не позна?».
**9.45, 15.05, 3.35** «Сямейныя вузы».
**11.30, 17.45, 2.40** «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
**12.25, 1.50, 6.10** «Жанчыны на сцежцы вайны».
**13.20, 23.05, 4.30** «Дора на варце парадку».
**16.00, 19.35, 22.10** «Дасканалая прыгажосць».
**0.00** «Прысутнасць Аніты».

### DIVA UNIVERSAL

**5.00, 2.30** Серыял «Дочкі Маклеода».
**5.45, 15.10, 0.50** Серыял «Вайна Фойла».
**7.25, 20.05** Маст. фільм «Багаж на выхадныя».
**8.55** Маст. фільм «Надзеі і чаканні Мэры».
**10.25** Маст. фільм «Калядныя пісьмы».
**12.00** Маст. фільм «Анёл Каляд».
**13.35** Маст. фільм «Залатыя Каляды».
**16.50, 23.10, 3.20** Серыял «Забойствы ў Мідсомеры».
**18.30** Маст. фільм «Калядныя прыгоды сямейства Фоксаў».
**21.40** Маст. фільм «Давай пажэнімся».

### SyFy

**7.30, 13.20** Зачараваныя.
**9.10, 15.00** Пункт прызначэння — праўда.
**10.00, 15.50, 0.45** Лоіс і Кларк.
**11.40** Па слядах прывідаў.
**12.30** Факт або выдумка: паранармальныя з'явы.

**17.30** Легенда пра Шукальніка.
**18.30** Драма «Агонь з апраметнай».
**20.00** Камедыя «Практычная магія».
**21.45** Драма «Тайны летняга доміка».
**23.15** Фантастыка «Яны сярод нас».
**1.35** Кароткаметражныя фільмы.

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Казка «Варвара-краса, Доўгая Каса».
**6.25, 10.25, 14.25** М/с «Баба-Яга супраць!» № 3; м/ф: «Агурочны конік», «Па шчупаковым жаданні».
**7.00, 11.00** Казка «Казка пра цара Салтана».
**8.00, 12.00** Казка «Коткін дом»; м/ф: «Дазвольце пагуляць з вашым сабакам», «Пеця і воўк».
**15.00** Маст. фільм «Вышэй за вясёлку». 1-я серыя.
**16.15** М/с «Аповеды старога марака». М/ф «Два білеты ў Індыю».
**17.00** Казка «Хлопчык з пальчык»; м/ф: «На чорны дзень», «Я чакаю птушаня», «Панцялей і пудзіла».
**18.00** Казка «Яблычны пірог»; м/ф: «Розныя колы», «Паважаны Лясун», «Трынаццаты рэйс».

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 9.30, 20.00, 0.30** Энцыклапедыя памылак.
**5.30, 20.30** Здароўе ад зоркі.
**6.20, 9.45, 15.05, 15.50, 21.20, 0.45** Азбука здароўя.
**6.25, 21.25** Будзем здаровыя.
**6.55, 21.55** Дзіцячая медыцына.
**7.30** Дзіцячы ўрач.
**8.00, 23.00** Пра дыеты і не толькі.
**8.40, 17.00, 23.40, 4.10** Набалелае пытанне.
**9.50** Найноўшыя дасягненні.
**10.30, 1.30** Зялёная аптэка.
**11.00, 15.55, 19.35** Ты тое, што ты ясі.
**11.35, 2.35** Жыццё або Смерць?
**12.00, 3.00** Вялікая прабежка.
**12.40, 03.40** Гісторыя хвароб.
**13.10** Піць або не піць?
**14.00** Як стаць маладзейшым.
**14.35** Я перамог гэты боль.
**15.10** Памылкі здароўя.
**16.30** Тайны медыцыны.
**17.50** Выдаткі вытворчасці.
**18.30** Сакрэты здароўя.
**18.55** Кабінет прыгажосці.
**22.30** Панацэя.
**0.50** Клінічны гіпноз.
**2.00** Правілы здароўя.

### ТДК

**6.00, 7.50, 16.55, 17.50, 18.50, 1.30** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 22.20** Усё лепшае, для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 23.30, 5.00** Ваш доктар.

**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00** Шлях поспеху.
**13.00, 2.00** Нашы дзеці.
**14.00, 4.00** Твой дом.
**16.00, 20.00** «Ваш асабісты псіхолаг».
**17.00** Красуня.
**19.00, 22.50** Люстэрка жыцця.
**21.00, 0.00** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.

### DISCOVERY

**7.00** Вялікія і хуткія.
**7.25, 15.15** Брудная работка.
**8.20, 19.00, 5.10** «З чаго гэта зроблена?».
**9.15, 18.00, 3.50** Разбуральнікі легендаў.
**10.10, 2.55, 6.05** Лабараторыя выбуховых ідэй.
**11.05** Выжыць любой цаной.
**12.00, 17.05** Зброя будучыні.
**12.55, 20.00, 1.00** «Top Gear».
**13.50** «Круты цюнінг».
**14.45** «Пятая перадача».
**16.10, 0.00** «Бяспека мяжаў».
**21.00, 2.00** На кручку.
**22.00** Смяротны ўлоў.
**4.45** «Маланкавыя катастрофы».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 18.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** Анатомія дыназаўраў.
**7.00, 12.00** Сонечнае зацьменне.
**8.00, 13.00** Пад востравам Пасхі.
**9.00** Акулы.
**10.00, 16.00, 4.00** Ідэальная зброя.
**11.00, 19.00** Зона будаўніцтва.
**11.30, 19.30** Я не ведаў гэтага.
**14.00** Жан-Мішэль Кусто: акіянскія прыгоды.
**15.00** Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
**17.00** Расследаванні авіякатастроф.
**20.00, 23.00, 2.00** Ліхтугі за мяжой.
**21.00, 0.00, 3.00** Паляўнічыя на нацыстаў.
**22.00** Тайны вакол нас.
**1.00** Тайны гісторыі.
**1.30** Секунды да катастрофы.

### TRAVEL

**5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**6.00, 12.30** Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
**7.00** Зямля качэўнікаў.
**8.00, 15.30** Сафі Грыгсан едзе на Усход.
**8.30, 16.00, 19.00, 0.00** Галівуд і вінаград.

**9.00, 22.00, 3.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**11.00** Кулінарная Азія.
**12.00, 16.30** Падарожжа са смакам.
**13.30** Насустрач мастацтву.
**15.00** Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
**18.00, 23.00** Водары.
**19.30, 0.30** Падарожжы сёння.
**20.00, 1.00** Раскошныя падарожжы вачыма відавочцы з Варунам Шармай.
**4.00** Даведнік для шукальнікаў прыгод.
**4.30** Вялікая рыба.

### ANIMAL PLANET

**7.00** Маёнтак сурыкатаў.
**7.25** Пад покрывам ночы.
**7.50** Дзённікі паляўнічага на练кракадзілаў.
**8.40** Усё пра сабак.
**9.10, 6.10** Коткі Кло-Хіл.
**10.05** Суперкрот.
**11.00** «Тэрыторыя жывёл».
**11.55** «SOS дзікай прыроды».
**12.50** Паліцыя Х'юстана. Аддзел па абароне жывёл.
**13.45** «Таварыства па выратаванні жывёл».
**14.10** Ветэрынары-стажоры.
**14.40** Дэніел і нашы коткі.
**15.30, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**16.30** Прыгоды Корвіна.
**17.25** Праект «Шчанюкі».
**18.20** Прыгоды Осціна Сціvenса.
**19.15, 1.40** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**21.05, 3.30** Небяспечныя маршруты Макса.
**22.00, 2.35** Неверагодныя падарожжы са Сцівам Леанардам.
**22.55, 4.25** Здабыча — чалавек.
**23.50, 5.20** Дзікія і небяспечныя.
**0.45** «Напад тыграў».

### EUROSPORT

**9.30, 12.00, 21.30, 0.00, 2.00** Ралі Дакар.
**10.00, 12.30, 14.30, 18.30, 0.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.

**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**13.30, 17.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**16.30, 1.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**19.45, 23.30** Дартс. Чэмпіянат свету.
**22.00** Пра рэстлінг.

### MTV

**5.00, 2.40** Music.
**9.15** «Губка Боб».
**10.55** Ужо можна.
**11.20** Сяброўка Перыс Хілтан.
**12.05** Праверка чутак.
**12.35** Зоркі на далоні.
**13.00** Хто круцейшы.
**13.25** Тачку на пракачку.
**14.10** Магія Крыса Энджэла.
**14.35, 19.00** Серыял «Ранеткі».
**15.25, 19.55** Серыял «Распешчаныя».
**16.10** Супердыскатэка 90-х.
**18.05** «Шопаголікі».
**20.50** Пакаленне MTV. Прадукты.
**21.40** Sensation 2010.
**23.40** MTV Караоке.

### ІНТЭР+

**7.00** Маст. фільм «Калі песня не канчаецца».
**8.25** Канцэрт Каці Лель «Джага-Джага».
**10.15** Маст. фільм «Шальменка дзяншчык».
**11.45** Канцэрт групы «Мандры».
**12.30** Канцэрт М. Жванецкага.
**13.45** Мюзікл «Аднакласнікі».
**17.00, 23.00, 5.20** Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры». 1-я серыя.
**18.30, 1.25** Месца сустрэчы. Песні на ўсе часы.
**20.00** Інфармацыйны канал «Падрабязнасці».
**20.30** Серыял «Заручальны пярсцёнак».
**21.20** Мюзікл «Навагоднія сваты».
**0.30** Пазаvочы. М. Баярскі.
**2.55** Інфармацыйны канал «Падрабязнасці».
**3.25** Асаблівасці інтэрнацыянальнага Новага года.

## 22.55 ФІЛЬМ ДНЯ

**«КАХАННЕ Ў ВЯЛІКІМ ГОРАДЗЕ»** (РАСІЯ, 2009 г.)

Гісторыя пра трох сяброў, якія жывуць у Нью-Ёрку, на якіх накладзены дзіўны праклён. Яны не могуць займацца сэксам з жанчынамі. І адзінае, што можа іх выратаваць — сапраўднае каханне.

**Рэжысёр** — Марус Вайсберг. **У ролях:** Вера Брэжнева, Аляксей Чадаў, Анастасія Задарожная, Уладзімір Зяленскі, Філіп Кіркораў.




## Извещение о проведении 31 января 2011 года открытого аукциона по продаже единым комплексом имущества ОАО «Минскремстрой» (филиал «Дом отдыха «На ростанях»)

Минский городской центр недвижимости

| | | Инвентарный № (кадастровый) |
|---|---|---|
| Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества) | Трехэтажный кирпичный спальный корпус с цокольным этажом (А3/к), мансардой (А3/к) общей площадью 1059,8 кв.м (спальный корпус № 1) | 600/С-68126 |
| | Трехэтажное кирпичное здание общественного центра со столовой с подвалом (А3/к), рампой, холодной пристройкой общей площадью 1939,8 кв.м (общественный центр со столовой) | 600/С-68157 |
| | Одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции общей площадью 53,6 кв.м | 600/С-81703 |
| | Одноэтажное кирпичное здание бани общей площадью 90,9 кв.м | 600/С-81699 |
| | Двухэтажное кирпичное здание спального корпуса с подвалом А2/к, входом в подвал общей площадью 289 кв.м (здание спального корпуса № 4) | 600/С-69016 |
| | Одноэтажное кирпичное здание газорегуляторного пункта общей площадью 36,4 кв.м | 600/С-69063 |
| | Одноэтажное бревенчатое здание столовой с пристройкой общей площадью 148,3 кв.м | 600/С-68053 |
| | Одноэтажное деревянное здание биллиардной общей площадью 29,5 кв.м | 600/С-68614 |
| | Одноэтажное дощатое здание контрольно-пропускного пункта общей площадью 5,8 кв.м | 600/С-81671 |
| | Одноэтажное кирпичное здание канализационно-насосной станции общей площадью 28,2 кв.м | 600/С-81658 |
| | Стоянка для машин общей площадью 273,2 кв.м | 600/С-115848 |
| | Сеть эфирно-кабельного телевидения, состоящая из участков сети и1, и2, и3 | 600/С-115809 |
| | Сети тепловые наружные, состоящие из тепловых камер г1-г12 | 600/С-115810 |
| | Одноэтажное кирпичное здание водонапорной башни общей площадью 14,5 кв.м | 600/С-81647 |
| | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 42,9 кв.м (ледник) | 600/С-69031 |
| | Одноэтажный деревянный склад общей площадью 30,2 кв.м | 600/С-68112 |
| | Одноэтажное каркасно-засыпное здание бытовки ХСУ общей площадью 48,3 кв.м | 600/С-81709 |
| | Двухэтажное бревенчатое здание спального корпуса с подвалом, двумя верандами, входом в подвал общей площадью 564,2 кв.м (спальный корпус № 3) | 600/С-68083 |
| | Трехэтажный кирпичный спальный корпус с подвалом (Е 3/к), мансардой (Е 3/к) общей площадью 1341,4 кв.м (спальный корпус № 2) | 600/С-68041 |
| | Ограждение, состоящее из ограждения из железобетонных панелей р1, ограждения из проволочной сетки на бетонном основании р2, ограждения из проволочной сетки р3 | 600/С-115839 |
| | Артскважина № 89021/2-91 | 600/С-115842 |
| | Артскважина № 89021/1-91 | 600/С-115844 |
| | Сети водопроводные с водопроводными колодцами ж1-ж20 | 600/С-115838 |
| | Сети телефонной связи с колодцами сетей телефонной связи в1...в22 | 600/С-115837 |
| | Сети канализационные (КНС-2), состоящие из напорной канализации Б1, самотечной канализации Б2, канализационных колодцев б1-б21 | 600/С-115808 |
| | Сети наружного освещения из участков сети т1, т2, т3, т4 | 600/С-115845 |
| | Спортивная площадка общей площадью 83,8 кв.м | 600/С-115846 |
| | Проезды и пешеходные дороги из проезжей части м1, пешеходных частей м2, м3 | 600/С-115847 |
| | Газопровод низкого давления | 600/С-115835 |
| | Сеть канализационная (КНС-1) из безнапорной канализационной сети А1, напорной канализационной сети А2, канализационной насосной станции А3, канализационных колодцев а1-1..а1-56 | 600/С-115841 |
| | Электрическая сеть из участка сети е1, е2... е41 | 600/С-115840 |
| | Одноэтажная крупнопанельная котельная с дымовой трубой, зданием баков конденсаторных общей площадью 205,8 кв.м | 600/С-68094 |
| | Одноэтажный сборно-щитовой спальный домик № 2 с двумя пристройками 1/к, 1/к общей площадью 76,0 кв.м | 600/С-67954 |
| | Одноэтажный сборно-щитовой спальный домик № 1 с пристройкой, крыльцом, навесом шашлычной общей площадью 52,6 кв.м | 600/С-67998 |
| | Одноэтажное кирпичное здание гаража с пристройкой Б1/б, крыльцом, бензохранилищем общей площадью 247,2 кв.м | 600/С-69040 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 623684100001000135, назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений дома отдыха «На ростанях», площадь – 8,6946 га | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Минская область, Минский район, Луговослободской с/с, район поселка Привольный | |
| Собственник продаваемого имущества (продавец) | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск, (017) 203 72 72, (029) 373 46 95 | |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 48 36 | |
| Начальная цена предмета торгов без учета НДС | 11 000 000 000 белорусских рублей | |
| Сумма задатка | 300 000 000 белорусских рублей | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **31 января 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 03.01.2011 по 28.01.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(017) 203 72 72, (029) 373 46 95 – ОАО «Минскремстрой».**


## У госці да пушыстых прыгажунь



Работа на ёлачным базары ў Смалявіцкім лясніцтве.

**Напярэдадні навагодніх святаў, калі неўзабаве ў хатах і кватэрах беларусаў пачне з'яўляцца галоўны сімвал Новага года, фотакарэспандэнт «Звязды» Марына Бегункова завітала ў госці да смалявіцкіх леснікоў.**

Ёлкі на любы густ можна набыць на ёлачных базарах ужо з 20 снежня ва ўсіх кутках краіны. Сёння лясных прыгажунь прадалі каля пяці тысяч, і чым бліжэй святы, тым больш клопатаў у леснікоў.

За сямнаццаць гадоў працы **ляснік Валмянскага лясніцтва Мікалай МАШУЛІК (на здымку)** выгадаваў шмат лясных прыгажунь не толькі для землякоў-смалявічан, але і для жыхароў сталіцы! Таму, магчыма, сам лёс дапамог завітаць сюды ў госці? У Валмянскім лясніцтве нарыхтоўка святочных прыгажунь ідзе поўным ходам. Прабіраемся амаль што па калена ў снезе — для «кадра» шукаем самую прыгожую елку, але вочы разбягаюцца — усе дрэвы пушыстыя, трошкі прысыпаныя ранішнім снегам. Шкада такія секчы! Але ж іх вырошчвалі на спецыяльных плантацыях знарок для навагодніх святаў. Плануецца, што сёлета каля двухсот тысяч святочных ёлак будуць радаваць беларусаў перад новым 2011 годам. А вы сабе ўжо выбралі?

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**
*Смалявіцкі раён.*


**Считать недействительными** страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 8868888, 8779203-8779204, 8868603, 1871444 квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) 1-СУ серии КС № 00225361, 00606827, 00225082, 00224755, страховые полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии БМ № 0234096, 0173317.



**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЧПТУП «ВЫСОТНИК»**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Адрес объектов продажи | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание швейной мастерской | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий. Одноэтажное кирпичное здание общей площадью 307 кв.м. Год постройки – 1989. Площадь земельного участка – 0,0658 га. | Гомельская область, Жлобинский р-н, Солонский с/с, д. Нивы, ул. Молодежная, д. 18 | 6 311 592 | 315 580 |

**Продавец имущества**: Управляющий в деле о банкротстве ЧПТУП «Высотник». Шаг торгов – 8 %. Вознаграждение – 5 % от цены продажи лота.

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **До 17.00 12 января 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| Дата, время, место проведения аукциона | **13 января 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| Номер р/с для перечисления залога | Р/с 3012029970016 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по г. Минску, код 334, ОКПО 55484006, УНП 102353509 |
| Условие продажи | Без условий. Цены указаны без НДС. |

Более подробная информация о перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в аукционе, опубликована в газете «Звязда» № 127 от 02.07.2010 г.

| | |
|---|---|
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность. |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87, 77 52 78, (044) 700 14 94 (факс).**

# КАНТАКТ

**«ПАШТОВАЯ СУВЯЗЬ НАБЫВАЕ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ ЎСЁ БОЛЬШУЮ ЗНАЧНАСЦЬ. У МНОГІМ ДЗЯКУЮЧЫ ТАМУ, ШТО... ЗАРАЗ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПЕРАДАВЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ.»**

**«ГАЗЕТА, ПІСЬМО, ПАСЫЛКА ПАВІННЫ Ў КАРОТКІ ТЭРМІН ПРЫЙСЦІ Ў ЛЮБУЮ, САМУЮ АДДАЛЕНУЮ ВЁСКУ.»**

№ 4 (4)
СПЕЦПРАЕКТ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» СУМЕСНА З РУП «БЕЛПОШТА» І РУП «БЕЛСАЮЗДРУК»

Нашы пераможцы

## «Звязда» клапоціцца пра паштальёнаў і кіяскёраў



Нэлла Сіняўская — кіяскёр РУП «Мінаблсаюздрук» у горадзе Маладзечна. Нядаўна «Звязда» ёй уручыла каштоўны прыз — цеплавентылятар, як пераможца сумеснага конкурсу па рэалізацыі газет у розніцу

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

**ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ і І ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.**

*Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)*

| Індэкс | месяц | І квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 | 74400 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 | 69600 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 | 119400 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 | 108000 |

***Заставайцеся з намі!***

Сяргей ПАТАПЕНКА, намеснік генеральнага дырэктара па тэхнічных пытаннях РУП «Белпошта»:

## «МЫ ПРЫКЛАДАЕМ МАКСІМУМ НАМАГАННЯЎ, КАБ БЫЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЫМІ І ДЗЕЙСНЫМІ Ў ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ»



**Сёлета Рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству «Белпошта» споўнілася 15 гадоў. Зразумела, што гэта дата — не зусім «круглая» і не падстава для таго, каб спакойна адпачываць на лаўрах. Тым больш што злыя языкі не перастаюць сцвярджаць: у эпоху інтэрнэту і ўкаранення ва ўсе віды дзейнасці высокіх тэхналогій патрэбы ў паштовых паслугах у хуткім часе могуць адпасці.**

**Няўжо такія чуткі маюць пад сабой глебу? Увогуле, як заканчвае 2010 год калектыў РУП «Белпошта» ў плане ўкаранення ці прымянення «прасунутых» метадаў работы?**

**Сёння наш суразмоўца — намеснік генеральнага дырэктара па тэхнічных пытаннях РУП «Белпошта» Сяргей ПАТАПЕНКА.**

***— Сяргей Аляксандравіч, калі верыць закулісным размовам, то пісьмы і тэлеграмы ў бліжэйшы час стануць здабыткам мінулага?***

— Не думаю, што так здарыцца, бо, гадзіцеся, наўрад ці знойдзецца вартая замена шчыраму сардэчнаму лісту, які можна некалькі разоў перачытаць, пакласці на некалькі гадоў на паліцу, а потым зноў прабегчы тэкст паслання. Прабачце за такое лірычнае адступленне.

Калі ж больш сур'ёзна, то адкажу так: пошта сёння — гэта ўжо не проста пісьмы і тэлеграмы, пераводы і пасылкі. Паштовая сувязь набывае ў сучасным свеце ўсё большую значнасць. У многім дзякуючы таму, што ў нашай сферы зараз выкарыстоўваюцца перадавыя інфармацыйныя тэхналогіі. А яны, у сваю чаргу, дазволілі работнікам пошты значна пашырыць спектр паслуг, што прапаноўваюцца, адкрыць перад кліентам сапраўды бязмежныя магчымасці.

***— Тут якраз напрошваецца пытанне пра ўкараненне ІТ-тэхналогій.***

— У вобласці высокіх тэхналогій быў рэалізаваны шэраг буйных і высокатэхналагічных праектаў, якія аказалі істотны ўплыў на якасць аказання паслуг у аб'ектах паштовай сувязі Рэспублікі Беларусь.

Напрыклад, рэалізацыя прынцыпу «аднаго акна» ў сферы наяўных і безнаяўных плацяжоў дазволіла РУП «Белпошта» ўпэўнена рэалізаваць сектар фінансавых паслуг.

Цяпер вялікая ўвага надаецца пытанням уніфікацыі рашэнняў. Была пастаўлена і тэхналагічна вырашана задача забеспячэння роўных функцыянальных магчымасцяў на рабочым месцы аператара паштовай сувязі, на паштовых прылад самаабслугоўвання, пры рабоце праз інтэрнэт.

Новым этапам развіцця функцыянальнасці ўсёй сеткі плацежна-даведачных тэрміналаў РУП «Белпошта» стала распрацоўка і ўкараненне шэрагу міжведамасных сумесных праектаў з Міністэрствам па падатках і зборах, з Дзяржаўным мытным камітэтам, з аператарамі сотавай рухомай электрасувязі.

***— У нашай краіне па-ранейшаму нямала аддаленых населеных пунктаў, для якіх, як кажуць у народзе, выгоды цывілізацыі прыходзяць са спазненнем.***

— Мяркую, што ў сістэме «Белпошты» гэтае пытанне вырашаецца своечасова. Для набліжэння паслуг у аддаленыя населеныя пункты арганізавана і ўдасканальваецца сістэма прадстаўлення паслуг насельніцтву праз рухомыя аддзяленні паштовай сувязі з выкарыстаннем аўтамабільнага транспарту.

***— Значыць, размовы пра магчымае «адміранне» паштовых паслуг — не больш чым «вутка»?***

— Думаю, што так. Гісторыя пошты налічвае не адно стагоддзе. Як вядома, першае ўпамінанне аб «паштовых паслугах» на тэрыторыі Беларусі апісваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» і датуецца 885 годам. З такой багатай гісторыяй, добрымі традыцыямі, шматгадовым вопытам работы і ўкараненнем ва ўсе сферы дзейнасці РУП «Белпошта» перадавых тэхналогій, што адпавядаюць лепшым еўрапейскім і сусветным стандартам, мы застаёмся аптымістамі і прыкладаем максімум намаганняў, каб быць запатрабаванымі і дзейснымі ў любой сітуацыі.

Будучыня пошты будзе залежаць ад яе здольнасці адаптавацца да зменаў, што адбываюцца на рынку сувязі. Пошта імкнецца аказваць паштовыя паслугі самай высокай якасці па ўмераных цэнах, а таксама забяспечваць больш шырокі асартымент прадукцыі і паслуг, што адпавядае патрэбам кліентуры, якія пастаянна ўзрастаюць.

РУП «Белпошта» не спыняецца на дасягнутым і, зыходзячы з досведу іншых краін, намеціла асноўныя кірункі развіцця паштовай сувязі, сярод якіх:

- аказанне ўніверсальных паслуг паштовай сувязі па даступных цэнах і з зададзенай якасцю на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;
- правядзенне комплекснай аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў;
- пашырэнне спектра паслуг, якія аказваюцца, за кошт выкарыстання новых інтэрнэт-тэхналогій;
- развіццё сістэмы карпаратыўнай лагістыкі;
- укараненне сучасных метадаў абслугоўвання карпаратыўных кліентаў;
- паляпшэнне якасці аказання паслуг паштовай сувязі.

Тэхналогіі абслугоўвання кліентаў, якія ўкараняюцца беларускай поштай і грунтуюцца на прымяненні сучасных інфармацыйных сістэм, закліканыя істотна павысіць узровень камфорту і зручнасці наведнікаў аддзяленняў паштовай сувязі, садзейнічаць рэалізацыі курсу кіраўніцтва краіны на ўсямернае павышэнне якасці абслугоўвання насельніцтва.

Такім чынам, задачы паспяховага функцыянавання паштовай сувязі ва ўмовах новай эканомікі непарыўна звязаныя са стварэннем развітага інфармацыйна-камунікацыйнага асяроддзя грамадства, што павінна забяспечыць істотнае павышэнне якасці жыцця насельніцтва і сацыяльна-палітычную стабільнасць грамадства і дзяржавы.



## ВІТАЕМ, ВІНШУЕМ, ЖАДАЕМ

Маленькі яскравы сюрпрыз, а з ім цёплыя словы для тых, каго любім, каго цэнім... Простая навагодняя паштоўка. Дробязь. А прыемна! З дзяцінства памятаю, якое было свята, калі ўсёй сям'ёй напярэдадні Новага года сядзелі, запаўнялі святочныя паштоўкі для сваякоў з іншых гарадоў. І як кожны дзень правяралі паштовую скрыню і абавязкова знаходзілі там прывітанні, віншаванні на паштоўках.

Сёння для большасці такую перадсвяточную перапіску замяніў мабільны переразвон у навагоднюю ноч. І як быццам мы нешта згубілі, як быццам сталі далей ад сваіх блізкіх. А можа, яшчэ не позна ўсё вярнуць. Так, удакладняем адрасы сваякоў і бяжым на пошту, альбо да кіёскаў і ў крамы «Белсаюздрука».

А можна завітаць на кірмаш-продаж паштовак, напрыклад, у сталічны Галоўпаштамт. У шырокім асартыменце тут прадстаўлены паштовыя наборы, канверты і паштоўкі. Багата і беларускамоўных паштовак з навагодняй і каляднай тэматыкай.



**ВІНШУЕМ УСІХ ПАРТНЁРАЎ, КЛІЕНТАЎ, ЧЫТАЧОЎ, ПАДПІСЧЫКАЎ, ПАШТАЛЬЁНАЎ, КІЯСКЁРАЎ З НАДЫХОДЗЯЧЫМ НОВЫМ 2011 ГОДАМ. ЖАДАЕМ УДАЧЫ, МОЦНАГА ЗДАРОЎЯ, СЯМЕЙНАГА ДАБРАБЫТУ, НОВЫХ ТВОРЧЫХ І ВЫТВОРЧЫХ ПОСПЕХАЎ**

## Пра паштовага Дзеда Мароза і карысць штодзённых газет



**Сённяшняе наша інтэрв'ю з дырэктарам Брэсцкага філіяла рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белпошта» Валянцінай ПУХ пра пераднавагоднія клопаты паштавікоў, а таксама пра клопаты, планы, задумкі на год будучы, 2011 год.**

***— Валянціна Мікалаеўна, за пяць хвілін да нашага інтэрв'ю зазірнула на галоўную пошту горада, што размешчана ў адным будынку з вашым офісам. Там ва ўсю ідзе запіс на паслугі паштовага Дзеда Мароза. Аж чарга невялікая да століка, за якім дзяўчына прымае заказы, выстраілася. Паштовы Дзед мае поспех?***

— Так, гэта паслуга стала надзвычай папулярнай у нашага насельніцтва. Цяпер навагодніх святаў без Дзеда Мароза мы ўжо проста не ўяўляем. Заказаў вельмі шмат. Пачынаючы з 24 снежня, пярэдадня каталіцкага Раства, і да 7 студзеня наш Мароз развозіць падарункі і віншаванні. Для віншаванняў розных катэгорый заяўнікаў распрацаваны спецыяльныя сцэнары: даводзіцца ўручаць падарункі дашкольнікам, дзецям крыху большым і нават дарослым кампаніям. Варта адзначыць, што знайшоўся чалавек у нашым калектыве з сапраўднымі акцёрскімі здольнасцямі. Таму з роляй сваёй ён спраўляецца бліскуча. Аднойчы, калі яго сын быў маленькі, хлопчык нават не пазнаў бацьку ў гэтай ролі і са шкадаваннем сказаў яму потым: «Тата, ты з-за сваёй работы прапусціў самае незвычайнае: мяне прыходзіў віншаваць Дзед Мароз».

***— Цікава, як да гэтага віду паслугі прыйшлі на пошце?***

— Пачалося ўсё гадоў дзесяць таму. Ідэю, хутчэй за ўсё, падказала пісьмо. Лісты Дзеду Марозу напярэдадні Новага года дзеці пачалі пісаць даўно. Вядома, яны спадзяваліся на нейкі адказ у выглядзе падарунка ці віншавання. Пошта ўжо даўно практыкуе паштоўкі-віншаванні. Паступова прыйшлі да таго, што можна дастаўляць не толькі паштоўку, але і падарунак. І лепш за ўсё, калі гэта зробіць казачны Дзед, такі чаканы дзятвой. Так склалася, што наш інжынер-электронік Васіль Козел на пераднавагодні тыдзень пераўвасабляецца ў галоўнага святочнага персанажа. А сёлета ён будзе працаваць з новай Снягуркай, у ролі якой выступае жонка Васіля Юр'евіча. Спадзяёмся, што іх сямейны дуэт будзе мець яшчэ большы поспех у маленькіх брастаўчан.

***— Гаворка ідзе пра лісты і віншаванні, якія атрымліваюць дзеці, а тыя лісты, што яны пішуць?..***

— Мы дастаўляем адрасату — Дзеду Марозу ў яго пушчанскую рэзідэнцыю. А яшчэ кожны год разам з аддзеламі адукацыі праводзім акцыю «Напішы ліст Дзеду Марозу» сярод школьнікаў шасці—дзесяці гадоў. У ходзе мерапрыемства дзеці найперш вучацца правільна афармляць пісьмо, пісаць адрас. Цяпер нашы школьнікі ведаюць, што на канверце трэба пісаць: аддзяленне паштовай сувязі «Камянюкі» Камянецкага раёна, каб пісьмо хутчэй знайшло адрасата. Абавязкова звяртаецца ўвага на тое, што адказ можна атрымаць тады, калі разборліва і правільна ўкажаш зваротны адрас.

***— У перадсвяточныя дні нагрузка на прадпрыемствы паштовай сувязі ўзрастае з павелічэннем патоку пісьмовай карэспандэнцыі, пасылак.***

— І не толькі. Напрыканцы снежня для нас актуальнай тэмай з'яўляецца падпіска на перыядычныя выданні. Зараз часцей за ўсё падпісчыкі праяўляюць актыўнасць менавіта ў апошні тыдзень кампаніі. Часткова такі падыход абумоўлены матэрыяльным фактарам, людзі разлічваюць свой бюджэт, святочныя траты, і ў гэтых расходах вылучаюць сродкі на любімыя выданні. Таму даводзіцца рэгуляваць рэжым работы сваіх прадпрыемстваў, каб задаволіць патрэбы ўсіх кліентаў.

***— А дзе больш актыўна ідзе падпіска: у горадзе ці вёсцы?***

— У вёсцы яна ідзе больш роўна. Як правіла, вясковыя жыхары з'яўляюцца пастаяннымі прыхільнікамі той ці іншай газеты, часопіса. Яны і афармляюць падпіску, не чакаючы самага канца падпісной кампаніі. У горадзе тэмп жыцця іншы, таму многія справы робяцца, так бы мовіць, на хаду. Дарэчы, некаторыя жыхары аддаленых вёсак, тых, дзе засталіся занятыя лічаныя хаты, знарок выпісваюць рэспубліканскую газету, каб паштальён прыходзіў да іх кожны дзень. Для іх паштовы работнік — самы надзейны ланцужок сувязі са знешнім светам. Ёсць сярод іх і чытачы «Звязды».

***— Вось яшчэ, аказваецца, у чым карысць штодзённых газет!***

— А як жа! Наш кліент з глыбінкі — асаблівы клопат. На парадку дня брэсцкіх паштавікоў, як і ўсяго прадпрыемства рэспублікі, стаіць усебаковае паляпшэнне паштовага абслугоўвання сельскага жыхара. Газета, пісьмо, пасылка павінны ў кароткі тэрмін прыйсці ў любую, самую аддаленую вёску. Для гэтага плануецца закупіць дадатковы парк аўтамабільнага транспарту, які, па-першае, паскорыць тэрміны дастаўкі, па-другое, скароціць штодзённыя кіламетры, якія паштальёны вымушаны пераадольваць пешшу, і па-трэцяе, паспрыяе бяспецы нашых работнікаў. Адпадзе патрэба паштальёнам хадзіць па некалькі кіламетраў праз лес і па бездарожжы. Ужо зараз мы пераглядаем маршруты, на складаныя і працяглыя стараемся ўладкоўваць мужчын.

Зараз такія матарызаваныя паштальёны працуюць у двух раёнах вобласці: Пружанскім і Ляхавіцкім. На маршруце Пружаны—Смаляны адна паштовая машына абслугоўвае восем населеных пунктаў. У Ляхавіцкім раёне паштальён на машыне штодня аб'язджае сем вёсак. Адразу бачна, што справу маем з зусім іншым узроўнем абслугоўвання. Гэта зручна для працаўніка і, вядома, для кліента. Бо ніякі паштальён не возьме столькі тавараў, калі ён выпраўляецца пехатой, колькі можна захапіць у машыну. А людзі, асабліва з глыбінкі, прывыклі, што пошта даставіць не толькі пісьмы-газеты, але і тавары народнага ўжытку. Ды і наогул, пешы паштальён — гэта ўчарашні дзень нашай галіны. У наступным годзе мы плануем закупіць па адной машыне на раён для сельскіх штодзённых маршрутаў, а ў далейшым яшчэ па два-тры аўтамабілі, каб паступова матарызаваць усю службу дастаўкі.

***— Што новае чакаецца ў абслугоўванні гарадскіх кліентаў?***

— Будзе ўсяляк удасканальвацца служба экспрэс-дастаўкі паштовых адпраўленняў. Ужо з 1 лістапада ва ўсіх гарадскіх аддзяленнях сувязі ажыццяўляецца прыём адпраўленняў з дастаўкай на наступны дзень. Па жаданні кліента яго пісьмо могуць прынесці да 10 гадзін раніцы, у заяўлены адпраўшчыкам час і на працягу ўсяго наступнага дня. Гэта паслуга вельмі выгадная і набывае ўсё большую папулярнасць. Атрымальніку не трэба ісці на пошту, чаканае адпраўленне яму прынясуць дадому, у офіс, на прадпрыемства, у арганізацыю. Мы ведаем, што ў райцэнтрах тэрміны дастаўкі карэспандэнцыі вызначаны да 14 гадзін. Калі ж чалавеку трэба атрымаць нейкі дакумент раней, то цяпер гэтую паслугу можна заказаць і атрымаць своечасова. А паміж Мінскам, Брэстам, Баранавічамі, Кобрынам, Бярозай, Івацэвічамі паштовыя стасункі можна ажыццяўляць у рэжыме «сёння на сёння». Гэта значыць, адрасат можа атрымаць карэспандэнцыю ў дзень адпраўлення.

Наогул падыходы да работы з кліентам, асабліва з юрыдычнымі асобамі, апошнім часам мяняюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Зараз, вобразна кажучы, не кліент ідзе на пошту, а пошта ідзе да кліента. Спецыяльна распрацаваныя праграмы дазваляюць прадпрыемствам і арганізацыям фарміраваць базы звестак, неабходных для адпраўкі любой карэспандэнцыі. Ім застаецца па электроннай пошце перадаць інфармацыю на прадпрыемства паштовай сувязі. Наш кур'ер яе забярэ, прывязе на спецыяльна выдзеленыя рабочыя месцы, дзе яе адсартуюць і накіруюць па прызначэнні.

***— Валянціна Мікалаеўна, прапаную вам вярнуцца да таго, з чаго мы пачыналі гутарку, да пераднавагодніх клопатаў. Але на гэты раз не ўсяго вялікага абласнога паштовага ведамства, а канкрэтнай гаспадыні і мамы, Валянціны Пух. Як у вашай сям'і рыхтуюцца да Новага года, як яго прынята адзначаць?***

— Ведаеце, мы больш урачыста адзначаем Каляды. Новы год таксама сустракаем усе разам з традыцыйным нашым пірагом. У маёй сям'і вельмі любяць пірагі. Зараз я гэтым не адна займаюся. Падраслі памочніцы: адна дачка — студэнтка, другая — старшакласніца, яны таксама нядрэнныя кулінаркі. Але найлепшае свята для нас Каляды. Гэта ідзе ад маёй сям'і і ад сям'і мужа, дзе свята Раства Хрыстовага заўсёды шанавалася і адзначалася. Цяпер мы таксама стараемся сустрэць яго разам з бацькамі — аднымі ці другімі. А калі даводзіцца святкаваць дома, загадзя прывозім шматок сена, каб разаслаць пад абрус. Перадкалядную куццю абавязкова рыхтуем з дванаццаці страў, сярод якіх найпершая — улюбёная мужам тушаныя грыбы. Яны сушацца летам, найлепшыя пакідаюцца да Каляд. Ну а на сам святочны дзень стол гатуем з дочкамі ў залежнасці ад настрою і фантазіі. Галоўнае на свяце, я лічу, не багацце і разнастайнасць страў, а агульны настрой — шчырасць і любоў, што пануюць за сталом.

## Да падпісчыка ў хату



У начальніка паштовага аддзялення Зінаіды Пілюцік і паштальёнаў вёскі Крыніца, што ў Пружанскім раёне, адказная пара — падпіска. Трэба ўсіх абысці, нагадаць падпісацца на ўлюбёнае выданне, расказаць пра іншыя газеты і часопісы. У зону абслугоўвання Людмілы Краўчук уваходзіць пяць населеных пунктаў, якія яна звычайна штодзень аб'язджае на веласіпедзе. Такі транспарт — самы надзейны памочнік, прынамсі да снегу. Калі ж завея замяце дарогі, тады даводзіцца разлічваць на свае ногі. Але ў любое надвор'е Людміла Іванаўна абавязкова наведае кожнага падпісчыка, прынясе свежае выданне, пенсію, што-кольвечы з тавараў, забярэ камунальныя плацяжы.



### Цікава ведаць...

Папярэднікамі газет лічацца паведамленні, якія распаўсюджваліся ў Старажытным Рыме пра падзеі, што адбываліся ў горадзе. Світкі «Штодзённыя справы рымскага народа» перапісваліся ад рукі, вывешваліся на плошчах і дастаўляліся палітыкам альбо знатным гараджанам.

❑

**Свой сучасны выгляд газеты атрымалі ў XVI стагоддзі. Тады і ўвайшло ў зварот само слова «газета» — па назве мелкай італьянскай манеты gazetta, якую плацілі звычайна за рукапісны лісток навін у Венецыі.**

❑

У Расіі і Беларусі першыя газеты — рукапісныя «веставыя лісты» — з'явіліся ў часы праўлення Міхаіла Фёдаравіча, з 1613 года. Яны мелі назву «стаўбцы», бо пісаліся слупкамі на прыклееных адзін да аднаго прадаўгаватых лістах. Пазней іх назву замянілі на больш еўрапейскую — «Куранты». Самым старым выданнем такога роду з тых, што дайшлі да нашых дзён, лічыцца экзэмпляр «Курантаў», які выйшаў у 1621 годзе.

❑

**У 1707 годзе была зроблена першая спроба стварэння газеты на беларускіх землях. Мінчанін С. Шчука прапаноўваў друкаваць у ёй інфармацыю з правінцый і распаўсюджваць бясплатна на паштовых станцыях.**

❑

У межах сучаснай Беларусі першыя газеты з'явіліся ў Гродне. Гэта былі «Gazeta Grodzienska» (1776) і «Wiadomosci Grodzienskie» (1792). Усе газеты выходзілі на польскай мове, бо беларуская была на той час забароненая.

❑

**З 1836 года ва ўсіх губернях Беларусі сталі выдавацца свае газеты — «Губернскія ведамасці», выходзілі і перыядычныя выданні праваслаўнай царквы. У 1898 годзе ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях выходзіла 14 газет.**

❑

Першай газетай на беларускай мове стала «Мужыцкая праўда», якую нелегальна выдавалі ў 1862—1863 гадах Кастусь Каліноўскі і яго паплечнікі.

❑

**Першымі легальнымі нацыянальнымі газетамі былі «Наша доля» і «Наша ніва», якія з'явіліся ў 1906 годзе; крыху пазней, у 1912—1914 гг. з'явіліся і першыя часопісы на беларускай мове — «Саха» і «Лучынка».**

❑

У 1772 годзе ў Беларусі і Расіі з'явілася падпіска. Аб'ява пра гэта была апублікавана ў «Санкт-Пецярбургскіх ведамасцях». Прэса па падпісцы рассылалася з Пецярбургскага паштамта.

**Паводле кнігі «Саюздрук. 90 гадоў».**

## ЛЮДЗІ СТАЛІ БОЛЬШ ЧЫТАЦЬ



Вы яшчэ не паспелі ўпрыгожыць ёлку? І пакуль не адчуваеце святочнай эйфарыі? Можа, варта схадзіць купіць свежую прэсу? Святочны настрой ужо даўно пануе ў гандлёвых пунктах ААТ «Магілёўсаюздрук» — тут шырока прадстаўлена навагодняя прадукцыя: сувеніры, падарачныя наборы, гірлянды, мішура, цацкі на ёлку. Вялікі выбар паштовак і календароў розных па памерах, па малюнках, ад розных вытворцаў. Любы пакупнік зможа сабе падабраць на свой густ і кашалёк.

Дырэктар ААТ «Магілёўсаюздрук» Аляксандр Чачора падводзіць вынікі адыходзячага года. Так, заўважана, што ў 2010 годзе на Магілёўшчыне людзі пачалі больш чытаць. Больш стала прадавацца і кніг, і перыядычных выданняў. Вырасла і падпіска.

Прынамсі, у Магілёве, як і ў сталіцы, чытачы могуць падпісвацца на свае любімыя газеты і часопісы прама ў крамах і кіёсках Саюздрука. Падпіска да запатрабавання мае свае перавагі. Яна таннейшая, бо вы самі забіраеце сваё выданне. Акрамя таго, не трэба баяцца, што ўсе нумары любімага перыядычнага выдання раскупяць — выпісаную газету вы зможаце забраць у зручны для вас час менавіта ў сваім кіёску.

Між іншым, гандлёвая сетка ААТ «Магілёўсаюздрук» даволі шырокая — гэта 223 кіёскі і 12 магазінаў. У Магілёве пачалі дзейнічаць гандлёвыя пункты новага тыпу — кіёскі з адкрытай выкладкай тавару. Вы можаце зайсці ўнутр такога кіёска. Не трэба стаяць у чарзе, каб папрасіць кіяскёра паказаць тое ці іншае выданне, усё бачна самім. Акрамя газет і часопісаў, у такіх міні-крамах можна набываць кнігі і іншыя тавары. Шырока прадстаўлена дзіцячая літаратура, і калі вы хочаце нешта падабраць свайму маленькаму разумніку, дык у падобных кіёсках гэта рабіць куды прасцей, адна справа разглядаць усё праз шкло, а зусім іншая, калі тавар можна ўзяць у рукі.

Дарэчы, у Магілёве ўжо дзейнічаюць чатыры кіёскі новага тыпу з адкрытай выкладкай тавару — два ў цэнтры, адзін у спальным раёне і яшчэ адзін побач з Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам харчавання.

Сёння ў крамах і кіёсках ААТ «Магілёўсаюздрук» прадаецца больш за 1400 найменняў перыядычных выданняў. У шырокім асартыменце прадстаўлены грамадска-палітычныя, навукова-папулярныя, інфармацыйна-аналітычныя, рэкламныя, дзіцячыя і іншыя выданні. Разам з газетай можна набыць папярова-мелаваную прадукцыю, канцтавары, парфумерна-касметычныя вырабы, сувеніры.

У кніжных крамах (у ААТ «Магілёўсаюздрук» іх чатыры) прадстаўлена больш за 30 тысяч найменняў кніг. Праца супрацоўнікаў у крамах арыентаваная такім чынам, каб вывучаць попыт чытача. Пад запыты фарміруюцца заказы, асартымент пастаянна пашыраецца. Між іншым, зараз у крамах праводзіцца акцыя «Кніга за паўцаны». «Магілёўсаюздрук» прапануе таксама аформіць падпіску на выданні па каталогу, у якім прадстаўлена больш 500 найменняў выданняў. Прадпрыемства пашырае рынак збыту перыядычных выданняў, заключае дагаворы на пастаўку перыядычнага друку ў гандлёвыя аб'екты прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці па абласным цэнтры і па Магілёўскай вобласці.

У начальніка аддзела друку ААТ «Магілёўсаюздрук» Іны Ракевіч пытаемся, якога кшталту інфармацыя запатрабаваная чытачамі Магілёўшчыны.

**— Безумоўна, перад выбарамі самымі папулярнымі былі грамадска-палітычныя выданні. Заўсёды ёсць попыт на тэматычныя і забаўляльныя выданні.**

На пытанне, якой жа павінна быць ідэальная газета, Іна Васільеўна, адказала, што ў такой газеце павінны быць разнастайныя рубрыкі, праблемныя матэрыялы, палітычныя і грамадскія навіны і, вядома, забаўляльныя рэчы, тэматычныя падборкі, прычым і тое, што цікава мужчынам, і тое, што падабаецца жанчынам.

Калектыў ААТ «Магілёўсаюздрук» спяшаецца павіншаваць з Новым годам і Калядамі сваіх калег і сваіх пакупнікоў. Усім жадае ўзаемапавагі, любові, радасці, дастатку!

**Матэрыялы спецпраекта падрыхтавалі: У. ЗДАНОВІЧ, С. ЯСКЕВІЧ, І. ЛАПАТО, А. ДЗЯДЗЮЛЯ.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 6357. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

## Кіруючая кампанія холдынгу «БелГАЗаўтасэрвіс»:

# «САМАЕ ЗНАЧНАЕ ДАСЯГНЕННЕ — зладжаны працаздольны калектыў, які можа вырашаць складаныя задачы»









**Сярод «народжаных у СССР» наўрад ці знойдзецца той, хто не ведае, як выглядае лагатып Горкаўскага аўтамабільнага завода. На працягу сваёй амаль 80-гадовай гісторыі прадпрыемства выпускала грузавікі для сельскай гаспадаркі, поўнапрыводныя грузавікі для Узброеных Сіл, паўтаратонкі, легкавыя аўтамабілі. «ГАЗ» — сапраўды народны брэнд. Добра ведае прадукцыю завода і маладое пакаленне беларусаў. Маршрутныя таксі, машыны «хуткай дапамогі», аўтафургоны самага рознага прызначэння, камерцыйныя аўто бегаюць сёння па беларускіх дарогах.**

**Адзіным афіцыйным дыстрыб'ютарам па продажы аўтамабіляў «ГАЗ» на тэрыторыі нашай краіны з'яўляецца ВГ ЗАТ «Кіруючая кампанія холдынгу «БелГАЗаўтасэрвіс», якая таксама займаецца рэалізацыяй запасных частак і тэхнічным абслугоўваннем у гарантыйны і паслягарантыйны перыяд. Сёлета кампаніі споўнілася 18 гадоў. З якімі дасягненнямі сустрэла яна сваё паўналецце, як мяркуе развівацца далей, нам расказаў генеральны дырэктар ВГ ЗАТ «Кіруючая кампанія холдынгу «БелГАЗаўтасэрвіс» Міхаіл Андрэевіч СУПРУНОВІЧ.**

***— Міхаіл Андрэевіч, думаю, не памылюся, калі скажу, што і для Вашай кампаніі, і для ўсяго Горкаўскага аўтамабільнага завода самай важнай падзеяй года стала з'яўленне мадэрнізаванай «ГАЗелі-БІЗНЭС»?***

— Безумоўна. На беларускім рынку яна была прадстаўлена ў сярэдзіне красавіка. На прэзентацыі прысутнічалі прэзідэнт «Групы ГАЗ» спадар Бу Андэрсан і дырэктар па рэалізацыі і маркетынгу Алег Маркаў. Гэта варты прадукт, які вельмі ўдала пайшоў на нашым рынку. Машына вылучаецца павышанай надзейнасцю (многія яе камплектуючыя — ад пастаўшчыкоў лепшых сусветных аўтамабільных брэндаў), бяспекай (у яе лепшая кіруемасць і агляднасць, павышаная ўстойлівасць на дарозе), камфортам (яна зручная ў кіраванні, мае абноўлены дызайн, зніжаны ўзровень шуму і вібрацыі, клімат-кантроль). Пры яе распрацоўцы была праведзена мадэрнізацыя рухавіка, задняга моста, КПП, рэсор, пярэдняй восі, сістэмы ўпуску. Акрамя таго, «ГАЗель-БІЗНЭС» валодае павышанай карозійнай трываласцю, у ёй выключана магчымасць перагрэву рухавіка. Ніводзін іншы «ГАЗаўскі» аўтамабіль не праходзіў раней такіх жорсткіх выпрабаванняў. Адзначу яшчэ, што набываць «ГАЗель-БІЗНЭС» выгадна. На яе ўстаноўлена мінімальная цана для аўтамабіляў гэтага класа, распрацаваны спецыяльныя лізінгавыя праграмы, ёсць спецыяльныя прапановы для карпаратыўных кліентаў. У гэтага аўтамабіля кароткі тэрмін акупнасці і высокі рэшткавы кошт. Заўсёды даступныя запасныя часткі і сэрвіс.

Гэта аўтамабіль камерцыйны, а прадпрымальнікі ўмеюць лічыць грошы. І калі яны бачаць, што аўтамабіль хутка сябе акупляе і пачынае прыносіць даход, яны будуць яго набываць. Апроч таго, у параўнанні з іншымі аўтамабілямі кошт валодання «ГАЗель-БІЗНЭС» ніжэйшы.

***— Не на шкоду якасці?***

— Якасць адасоблена ад цаны ні пра што не сведчыць. Можна дасягнуць выключна высокай якасці дзякуючы высокаму кошту. А вось суадносіны цаны і якасці — гэта якраз той паказчык, які характарызуе не толькі аўтамабіль, але і любую канкурэнтаздольную прадукцыю.

***— Я так разумею, што няпростая эканамічная сітуацыя, у якой апынуліся ўсе вытворцы падчас фінансава-эканамічнага крызісу, стала для Горкаўскага аўтамабільнага завода стымулам для пошуку новых свежых ідэй і рэалізацыі перспектыўных праектаў?***

— Менавіта так. Калі ў час крызісу не працаваць у кірунку павышэння якасці пры захаванні цаны, то выжыць будзе немагчыма. Мы ў «БелГАЗаўтасэрвісе» ўжо выйшлі на дакрызісны ўзровень продажу. Беларусь увогуле крызіс закрануў значна менш: дзякуючы шэрагу адпаведных рашэнняў урада, бізнэс у нашай краіне значна больш абаронены. Дзяржаўнае рэгуляванне, якое існуе на Беларусі, прынесла станоўчы вынік. У краінах з большай доляй рынкавай эканомікі страты і ўрон ад крызісу значна большыя.

Беларускі рынак стабільны. Акрамя таго, тут самая развітая сэрвісна-збытавая сетка «ГАЗа» на постсавецкай прасторы. У кожным абласным цэнтры, практычна ва ўсіх гарадах з насельніцтвам звыш 100 тысяч чалавек, а таксама ў шэрагу раённых цэнтраў з меншай колькасцю жыхароў ёсць наша прадпрыемства сэрвісу, дзе таксама можна купіць і аўтамабілі, і запасныя часткі. Улічыце яшчэ, што вузкая спецыялізацыя на прадукцыі аднаго вытворцы павышае якасць сэрвісных работ.

Цяпер мы гандлюем выключна камерцыйнымі аўтамабілямі. А камерцыйныя аўтамабілі павінны працаваць, яны не могуць прастойваць. Калі легкавы аўтамабіль мае замену (грамадскі транспарт, машына сваяка і г.д.), то ў камерцыйнага аўтамабіля такой замены няма. Таму вельмі важна, што большасць адрамантаваных машын (90 працэнтаў) мы вяртаем кліенту ў дзень звароту да нас. Мы маем значныя аб'ёмы запасных частак — практычна для ўсяго мадэльнага рада (а наменклатура ў нас вельмі шырокая). Калі ўзяць любы іншы аўтамабільны брэнд — заходні ці ўсходні — то машына ў чаканні запчастак можа прастаяць на рамонце і 2, і 3 месяцы. У нас такога не бывае. Аператыўнасць у многім абумоўлена высокім прафесіяналізмам персаналу. Цяпер у нас з'явіўся варты прадукт, з якім не сорамна выйсці на рынак. І я маю на ўвазе не толькі «ГАЗель-БІЗНЭС», але і камерцыйныя аўтамабілі сярэдняга класа ГАЗ-3309, поўнапрыводныя ГАЗ-33081, сярэднятанажныя аўтамабілі новага пакалення «Валдай» і больш лёгкія камерцыйныя аўтамабілі «Собаль».

Шкада, што ў нас знік легкавы аўтамабіль. На Беларусі мы прадавалі каля 500 легкавікоў у год. Акрамя таго, зараз мы не прадаём нашы мікрааўтобусы (яны не адпавядаюць еўрапейскім стандартам для выкарыстання ў якасці маршрутных таксі). З-за таго, што «выпалі» такія аўтамабілі, нам сёння складана дасягнуць ранейшых аб'ёмаў продажу толькі за кошт камерцыйных аўтамабіляў. Пакуль што няма замены легкавога аўтамабіля, але думаю, нешта абавязкова з'явіцца. Распрацоўкі ў гэтым кірунку на заводзе вядуцца.



Генеральны дырэктар Міхаіл СУПРУНОВІЧ.

***— Нягледзячы на ўсе складаныя вонкавыя абставіны, ваша кампанія працуе стабільна і рэнтабельна. У чым сакрэт поспеху?***

— Асаблівае значэнне ў паспяховай рабоце такога прадпрыемства, як наша, мае персанал, яго высокая кваліфікацыя. Асноўны касцяк працуе ўжо шмат гадоў, пастаянна павышае свой прафесійны ўзровень і адпаведна — узровень абслугоўвання аўтамабіляў. Год ад года ў нас скарачаецца колькасць нараканняў і заўваг з боку кліентаў на якасць абслугоўвання. Вядома, не апошнюю ролю тут іграе і якасць запасных частак, але без умелых рук і разумнай галавы таксама не абысціся. Для таго, каб затрымаць у сябе высокакваліфікаваны персанал, мы забяспечваем людзям годны ўзровень заработнай платы. У нас сярэдні заробак у сетцы па рэспубліцы (з улікам усіх катэгорый работнікаў) у лістападзе склаў 1,7 мільёна рублёў, а па галаўным прадпрыемстве холдынгу — 2,4 мільёна. Як бачыце, той узровень заробку, які вызначыла кіраўніцтва дзяржавы, мы перавысілі. Сёння ва ўсім холдынгу ў нас працуе каля 800 чалавек, з іх на галаўным прадпрыемстве каля 250.

***— Можна меркаваць, што працэнт «цякучкі» кадраў у вас зусім невысокі?***

— Цякучка ў нас ёсць, але за кошт тых, хто прыходзіць «часова». Гэта людзі, якія не могуць ці не хочуць працаваць належным чынам. Мы з імі развітваемся. Зразумела, што пад высокі заробак мы патрабуем аддачы: высокага тэмпу работы і належнага ўзроўню якасці. Не ва ўсіх атрымліваецца ў нас затрымацца. Адсеў у нас жорсткі. На працягу трохмесячнага выпрабавальнага тэрміну мы пільна сочым за новым работнікам, ацэньваем яго прафесіяналізм і аператыўнасць. На працоўным месцы ў нас не п'юць, не кураць, лынды не б'юць. Кантроль за працоўнай дысцыплінай у нас на належным узроўні.

Яшчэ раз падкрэслю: мы дабіліся стабільнай работы нашага калектыву, касцяк персаналу ў нас захоўваецца на працягу многіх гадоў і пастаянна павышае свой узровень кваліфікацыі. Асабліва хацеў бы адзначыць наступных працаўнікоў: Дзярыба Алу Анатольеўну, Сяргеева Андрэя Уладзіміравіча з бізнэсу запчастак, Лявоненку Дзмітрыя Віктаравіча з бізнэсу аўтамабіляў, Анікеенку Віталя Сяргеевіча і Каленіка Андрэя Міхайлавіча з бізнэсу тэхнічнага сэрвісу. Усіх не пералічыць.

Мы не шкадуем грошай на навучанне нашых інжынерна-тэхнічных работнікаў, майстроў, слесараў. Праводзім заняткі як на месцы, так і ў камандзіроўках, у Расіі.

***— Раскажыце, якія пераўтварэнні адбыліся на «БелГАЗаўтасэрвісе» ў год яго паўналецця?***

— Сёлета мы сталі дарослымі, нам споўнілася 18 гадоў. Дасягнуўшы паўналецця, мы цяпер павінны глядзець наперад па-даросламу і прымаць адпаведныя рашэнні. Так, да 18-годдзя мы якраз стварылі холдынг. Раней у нас была разрозненая сетка прадпрыемстваў — дзесьці з удзелам нашага капіталу, дзесьці без (аднак мы і сёння працягваем супрацоўнічаць з прадпрыемствамі рознай формы ўласнасці, якія не ўваходзяць у холдынг — як з дзяржаўнымі, так і з камерцыйнымі). Мы паставілі перад сабой задачу: цалкам «закрыць» уласнымі сіламі патрэбы Мінска і прыгарадаў, а таксама Гомельскую і Брэсцкую вобласці. Там у нас сёння ўжо скончана фарміраванне сеткі. Цяпер фарміруем сетку ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Акрамя абласных цэнтраў, нашы прадпрыемствы будуць працаваць у Бабруйску і Полацку (між іншым, у Полацку яно працуе даўно, але цяпер акрамя продажу там будуць аказвацца і сэрвісныя паслугі).





У 2009 годзе ў «БелГАЗаўтасэрвісе» мы распачалі вытворчасць аўтамабільных фургонаў. Сёння на прадпрыемстве вырабляецца і сертыфікавана 5 тыпаў аўтафургонаў. Акрамя таго, сёлета мы распачалі і сертыфікуем вытворчасць аўтамабіляў, устанаўліваем на іх мінскія дызельныя рухавікі. Сам «ГАЗ», на жаль, перайшоў на кітайскія дызелі, а мы бяром на «ГАЗе» камплекты без рухавіка і ставім мінскі дызель. Нам і нашым кліентам ён добра знаёмы, абслугоўваннем займаемся сумесна з Мінскім маторным заводам. Я мяркую, што ў наступным годзе мы вырабім не менш за 500-700 такіх аўтамабіляў і каля 300 аўтафургонаў. Між іншым, на аўтафургоны нам ужо паступілі заказы ад шэрагу прадпрыемстваў, у тым ліку ад «Атлант-М» і ад літоўскай аўтамабільнай кампаніі.

***— Дарэчы, Еўропа — і ўсходняя, і заходняя набывае «ГАЗелі» літоўскай зборкі, а ці можа і Беларусь з часам пацясніць Літву і адваяваць у яе частку еўрапейскага рынку?***

— Мы не будзем цясніць Літву, лепш будзем сябраваць. З літоўцамі мы дамовіліся аб стварэнні сумеснага прадпрыемства ў Германіі па продажу аўтамабіляў «ГАЗель». Будзем прадаваць іх аўтамабілі ў Беларусі і разам з імі прадаваць «ГАЗелі» ў Германіі (у тым ліку камплектуючы гэтыя аўтамабілі сваімі аўтафургонамі і грузавымі платформамі). Партнёрства заўсёды больш выгадна за супрацьстаянне і канкурэнцыю.

***— Як змянілася за апошнія гады на Беларусі суаднясенне попыту на розныя мадэлі прадукцыі Горкаўскага аўтамабільнага завода?***

— Як я ўжо казаў, не стала легкавога аўтамабіля, практычна сышлі з нашага рынку мікрааўтобусы-маршруткі. Цяпер, калі выйшла «ГАЗель-БІЗНЭС», мы сталі прадаваць больш «ГАЗеляў», а так у нас, як правіла, прадавалася працэнтаў 20 легкавых аўтамабіляў, працэнтаў 40 — «ГАЗеляў» і столькі ж — сярэдніх грузавікоў. Цяпер працэнтаў 40 — грузавікоў і 60 — лёгкіх камерцыйных аўтамабіляў.

***— На пачатку года агучвалася ідэя запусціць у вытворчасць газабалонную версію «ГАЗелі-БІЗНЭС». Ці атрымалася?***

— Гэты кірунак таксама развіваецца. Устаноўка італьянскага газавага абсталявання праводзіцца непасрэдна на заводзе. Можна зрабіць заказ, і на «ГАЗе» зробяць аўтамабіль на газе (выбачайце за каламбур). Напрыклад, наша беларускае прадпрыемства ААТ «Аўтатаксасэрвіс», якое ўваходзіць у структуру холдынгу і дзе мы сёння маем 2/3 пакета акцый, таксама ўстанаўлівае на машыны «ГАЗель» газабалоннае абсталяванне.

***— Ці практыкуецца ў вас зваротная сувязь з кліентамі, апытанне, маніторынг?***

— Вядома. Хаця тут і без маніторынгу ўсё бачна — усе аўтамабілі, якія мы прадалі, вяртаюцца да нас на тэхнічны сэрвіс. На Беларусі няма іншай сеткі абслугоўвання гэтых аўтамабіляў. Ёсць карпаратыўныя буйныя кліенты, якія маюць уласную базу абслугоўвання, але калі ўзнікаюць пытанні па гарантыйным рамонце, яны, зразумела, едуць да нас.

***— Існуе меркаванне, што выпрабляць вельмі якасны аўтамабіль вытворцу нявыгадна — бо калі ў ім нічога не выходзіць са строю, то чалавеку не спатрэбіцца новы «жалезны конь»...***

— Гэта тычыцца не толькі аўтамабіляў, а практычна любой тэхнікі. Напрыклад, я сабе пасля вяселля набыў халадзільнік «Саратаў», які да гэтага часу знаходзіцца ў працоўным стане (а я жанаты 36 гадоў!). Спажыўцу шкада выкідваць спраўную рэч, аднак нездарма ж усе вытворцы разлічваюць аптымальныя тэрміны эксплуатацыі. Нягледзячы на высокую якасць, тэхніка некалі ўсё ж зламаецца (вечнага нічога няма). Гэта можа адбыцца нечакана і прынесці непрыемныя наступствы. У аўтамабілях гэта асабліва небяспечна, таму не варта імкнуцца эксплуатаваць іх некалькі дзесяцігоддзяў. Усё ж тэхнічны прагрэс не стаіць на месцы (аўтамабілі старэюць і фізічна, і маральна). Дзесяці гадоў цалкам дастаткова для аднаго новага аўтамабіля.

А мы, прадаўцы, зацікаўленыя ў пашырэнні разнастайнасці формаў продажу, у тым, каб зрабіць пакупку больш даступнай і лёгкай. Як я ўжо казаў, мы практыкуем продаж аўтамабіляў у лізінг. Сёлета, дзякуючы лізінгу, аб'ёмы продажу ўзраслі на 7 працэнтаў. Мы і раней займаліся лізінгам, але не так актыўна, як сёлета. Мо і нашы спажыўцы сталі больш дасведчанымі. Ад завода-вытворцы мы атрымалі пад лізінг 5-працэнтную зніжку, якую перанеслі ў лізінгавую стаўку, са свайго боку знайшлі магчымасць прапанаваць яшчэ 5-працэнтную зніжку. Атрымліваецца, што агульная 10-працэнтная зніжка «з'ядае» працэнты па лізінгавых выплатах. Набываць у нас аўтамабілі ў лізінг вельмі выгадна. Пры 30-працэнтнай аплаце стаўка будзе 2,99 працэнта. Пры 40-працэнтнай аплаце — усяго 0,99 працэнта.










***— У любога рынку ёсць пэўная гранічная мяжа напаўняльнасці. Калі гаварыць канкрэтна пра Беларусь і камерцыйныя аўтамабілі, тут мы ўжо наблізіліся да гэтай крытычнай мяжы, ці ёсць яшчэ рэзерв?***

— Я не думаю, што мы падышлі да гэтай мяжы. Акрамя таго, ёсць жа і сумежныя нішы, якія таксама можна займаць. «ГАЗель-БІЗНЭС» дазваляе сёння заняць нішу іншамарак — як тых, што былі ў карыстанні, так і новых. Яна ў стане крыху пасунуць і тых, і другіх. Гэты рынак для нас пашыраецца. На Беларусі актыўна развіваецца прадпрымальніцтва, яму патрэбны лёгкія камерцыйныя аўтамабілі. Ды і ўвогуле нашы людзі багацеюць, хочуць нечага новага, лепшага, больш прасторнага. І мы маем што ім прапанаваць.

Яшчэ адзін перспектыўны кірунак — спецтэхніка. Можна ўзяць наш цэльнаметалічны фургон і ператварыць яго ў санітарны ці пажарны аўтамабіль, у машыну тэхдапамогі і інш. Дапрацоўкай нашых машын пад спецыялізацыю займаюцца беларускія прадпрыемствы. Мы пастаўляем шасі ў Мінск, Пінск, Брэст, Гродна і г.д. — усяго на 7 прадпрыемстваў. Мінск вырабляе разнастайныя фургоны, Пінскі завод малой механізацыі ўстанаўлівае на наша шасі аўтавышкі. Брэсцкі завод — абсталяванне для дарожных машын. У Гродне выпускаюць бензавозы і малакавозы.

***— Ці не ўзнікала ў вас пасля стварэння холдынгу жаданне асвоіць нейкія новыя кірункі бізнэсу?***

— Сёлета мы ўжо стварылі яшчэ адзін непрофільны для нас бізнэс — «Аграсядзібу Супруновічы». У Калінкавічах набылі памяшканне казармы на тэрыторыі былой ваеннай базы, дзе ўжо наладзілі вытворчасць піламатэрыялаў. Далей зоймемся больш глыбокай перапрацоўкай драўніны. А ўсё для таго, каб выкарыстаць адходы драўніны на тэхналагічнае ацяпленне пляцоўкі, дзе мяркуем займацца ўпакоўкай сельгаспрадукцыі. Сёння на Беларусі існуе праблема: мы ўмеем вырошчваць, але не ўмеем прывабна запакаваць і зрабіць тавар кідкім. Тыя ж кашы на нашых паліцах чамусьці з Чалябінска. Кошт прадукцыі з-за ўпакоўкі ўзрастае ў некалькі разоў. Мы мяркуем стварыць такі кірунак у Калінкавічах, будзем займацца вытворчасцю, перапрацоўкай і ўпакоўкай сельгаспрадукцыі.

З часам у «Аграсядзібе Супруновічы», магчыма, будзем аказваць і турыстычныя паслугі. Мы мяркуем набыць там двухпавярховы дом, які можна пераабсталяваць у гасцініцу і развіваць агратурызм. Краявіды там цудоўныя, сам ведаю, бо гэта — мая малая радзіма.

***— Ці варта чакаць ад кампаніі холдынгу і іншых няпрофільных адгалінаванняў?***

— Магчыма. У мяне ёсць такая ідэя: хачу, каб усе нашы прадпрыемствы, якія размешчаны ў райцэнтрах і невялікіх гарадах, развівалі іншыя кірункі бізнэсу. Мы будзем ім нешта падбіраць і прапаноўваць — профільнае ці няпрофільнае (ад глыбокай перапрацоўкі сельгаспрадукцыі да вытворчасці тых жа кузаваў для нашых аўтамабіляў).

***— Што вы лічыце самым значным дасягненнем прадпрыемства за 18 гадоў і да чаго, на ваш погляд, яшчэ трэба імкнуцца?***

— Самым значным нашым дасягненнем я лічу тое, што мы стварылі такі зладжаны працаздольны калектыў, які можа вырашаць складаныя задачы, што сёння перад ім пастаўлены. Астатняе — прыкладаецца да гэтага асноўнага фактару. Гэта матэрыяльна-тэхнічная база, якую мы стварылі: мы маем буйныя асноўныя фонды (нерухомасць, першакласнае абсталяванне), шмат трацім на ўдасканаленне абсталявання і будынкаў. У нас усюды праведзены рамонт, устаноўлены ралетныя дзверы, шклопакеты. Тэмпература ў боксах плюс 14 градусаў па Цэльсію.Там, дзе па тэхналогіі патрэбна вышэйшая тэмпература, можам яе ўзняць. Сёлета мы шмат затрацілі на добраўпарадкаванне — і ўнутранае і знешняе. Без людзей нічога не зробіш, а людзі могуць усё. І ўсе поспехі, якіх мы дасягнулі, — гэта вынік работы ўсяго калектыву. Наш тавараварот па холдынгу за год складзе каля 200 мільярдаў рублёў, каля 7 мільярдаў — прыбытак. А тыя падаткі, якія мы плацім у бюджэт, гавораць самі за сябе (мы сёння ў раёне з'яўляемся бюджэтаўтваральным прадпрыемствам).

Вясной мы пачынаем будаўніцтва на праспекце Жукава вялікага гандлёва-вытворчага комплексу на 24 тысячы квадратных метраў, дзе размесцяцца аўтасалоны, сэрвісныя і гандлёвыя прадпрыемствы, гасцініцы, офісы. Мы пачынаем будаўніцтва самі, але плануем заахвочваць да ўдзелу іншыя арганізацыі, прыцягваць дольшчыкаў, шукаць інвестараў. Нешта будзем будаваць для сябе, нешта — для іншых. Нам, вядома, столькі плошчы не патрэбна. Але калі не зможам лішкі прадаць, то будзем там арганізоўваць паралельныя бізнэсы, напрыклад, гасцінічны ці рэстаранны. І тут галоўнае — людзі. Людзі вызначаюць усе. Знойдзеш патрэбнага чалавека на бізнэс — будзе працаваць бізнэс. Вельмі важна, каб кожны быў на сваім месцы.

**Карыстаючыся магчымасцю, віншую супрацоўнікаў нашай кампаніі, калег і партнёраў з Новым годам. Жадаю здароўя, удачы і сямейнага дабрабыту.**

*І як стала вядома пасля інтэрв'ю, 22 снежня на дылерскай канферэнцыі ў Ніжнім Ноўгарадзе «БелГАЗаўтасэрвіс» узнагароджаны прызам як «лепшы імпарцёр на рынку краін СНД». З гэтым я віншую ўвесь калектыў свайго прадпрыемства, усіх супрацоўнікаў холдынгу і ўсе прадпрыемствы, якія ўваходзяць у сэрвісна-збытавую сетку, і вельмі ўдзячны за карысную працу. Таксама ўдзячны ўсім кліентам, якія зрабілі правільны выбар.*

**Матэрыял падрыхтавалі Таіса ВАСІЛЬЕВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва прадпрыемства.**



ПТ ЗАО «Управляющая компания холдинга БелГАЗавтосервис»
ОФИЦИАЛЬНЫЙ ДИЛЕР ОАО «ГАЗ» в РБ
220024, г.Минск п/у Колядичи ул.Бабушкина, 25 т/ф (017) 291-81-11
www.belgaz.by
ОРИГИНАЛЬНЫЕ ЗАПАСНЫЕ ЧАСТИ ГАЗ
г.Минск, ул.Бабушкина, 25,(017) 291-83-64, 291-92-21, 291-92-23
ГАЗ ДЕТАЛИ МАШИН
Сеть магазинов "ГАЗ" ДЕТАЛИ МАШИН"
г. Минск: (017) 291 83 42, 220 63 64, 203 61 92
г. Брест: (0162) 44 86 99, 40 54 22
г. Пинск: (0165) 34 55 02, г.Береза: (01643)4 29 45
г. Клецк: (01793) 5 35 83,г.Полоцк: (0214)43 57 55
г. Калинковичи: (02345) 4 60 26, г.Жлобин: (02334)3 200 8
Более 15 000 наименований запчастей
Станция Технического Обслуживания
АВТОЦЕНТР ГАЗ КОЛЯДИЧИ
ТО и все виды ремонта автомобилей марки ГАЗ
гарантийное обслуживание
кузовной ремонт любой сложности любых марок автомобилей
шиномонтаж, пылесос, экспресс-замена масла, услуги эвакуатора, автомойка
наличная и безналичная форма оплаты
г.Минск, п/у Колядичи, ул.Бабушкина, 25
(017)291-82-86, 291-07-72, 291-05-88
МЫ РАБОТАЕМ ДЛЯ ВАС с 8.00 до 21.00 выходной-воскресенье!
*Ліцэнзія № 50000/0471608 ад 18.12.2008 г. да 18.12.2013 г. УНП 100123046.*

